КАНДЫДАТЫ ФЭН — ГЭТА ТВАЕ КАНДЫДАТЫ!

Ніва
БЕЛАРУСКІ ТЫДНЁВІК
№ 49 (928) ГОД XVIII БЕЛАСТОК 9 СНЕЖНЯ 1973 г. ЦАНА 60 гр.

ВЫНІКІ ЗАЛЕЖАЦЬ АД НАС



(РАЗМОВА З МІКАЛАЕМ САМОЦІКАМ — СТАРШЫНЁЙ ГП БГКТ)

Наша размова з старшынёй Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства Мікалаем Самоцікам — кандыдатам у Ваяводскую раду народовую ў Беластоку — адбылася ў момант, калі ён рыхтаваўся да сустрэчы са сваімі выбаршчыкамі. На парадку дня стаяла таксама справа падрыхтоўкі матэрыялаў на чарговае пасяджэнне Прэзідыума ГП БГКТ.

— Таварыш старшыня, на якіх напрамках БГКТ канцэнтравала сваю працу ў апошні час?

— Наша таварыства з'яўляецца састаўной часткай Фронту адзінства народу, і ўсе яго члены — сяляне, рабочыя, інтэлігенцыя, моладзь — актыўна ўдзельнічаюць у гаспадарчым, культурным і грамадскім жыцці беластоцкага рэгіёну, усёй нашай краіны. Мы заахвочвалі членаў нашай арганізацыі да павышэння ўраджайнасці і павелічэння гадоўлі ў іх гаспадарках, да ўдзелу ў конкурсах „Беластоцкая вёска гаспадарная і культурная" і „Жыхары свайму гораду", папулярызавалі грамадскія чыны на карысць асяроддзя пры рамонце і будове дарог, пры пасадцы дрэў, будове святліц і іншых аб'ектаў культурнага жыцця. Гурткі БГКТ у Гурным, Старым Корніне, Чыжах і Сухавольцах ў Гайнаўскім павеце, у Дубяжыне і Плёсках у Бельскім, у Гарадку, Паўлах, Меляшках і Новай Волі ў Беластоцкім, у Сухінічах у Сакольскім, Мілейчыцах у Сямяцкім, у гарадскім аддзеле ў Беластоку і шэраг іншых нашых звенняў развівалі актыўную культурную дзейнасць. Фэстыны, конкурсы і агляды самадзейных драматычных калектываў БГКТ сталі значнымі падзеямі ў культурным руху Беласточчыны. Асабліўую ўвагу наша арганізацыя звярнула на папулярызацыю ведаў аб СССР і ўнесла вялікі ўклад у адзначэнне Дзён Беларускай ССР на Беласточчыне. Некалькі тыдняў таму назад закончылася святкаванне 30-годдзя Людовага Войска Польскага, у якім актыўны ўдзел прынялі Галоўнае праўленне, аддзелы і гурткі БГКТ. Зразумела, усё гэта наша таварыства праводзіла супольна з іншымі грамадскімі арганізацыямі Беласточчыны.

— Якія заданні будуць стаяць у бліжэйшы час перад БГКТ?

— Усё наша грамадства рыхтуецца да ўрачыстага адзначэння 30-годдзя Народнай Польшчы. У яго ўнясе свой уклад

Працяг на стар. 4

ПРАГРАМА ПАРТЫІ — НАША ПРАГРАМА



9 снежня адбудуцца выбары ў рады народовыя. Адбудуцца яны ў знамянальны час. У час паскорання развіцця і мадэрнізацыі нацыянальнай гаспадаркі. У час адчувальнага паляпшэння жыццёвых умоў працоўных. Гэты час стварылі апошнія гады, праграма VI З'езду ПАРП.

I Краёвая партыйная канферэнцыя выказалася за рашучае і паслядоўнае працягванне праграмнай лініі VI З'езду. Праграма гэта адпавядае патрабаванням народа. Рашэнні канферэнцыі сталі і выбарчай платформай Фронту адзінства народу ў выбарах у рады нарадовыя, сталі праграмай усіх нас, грамадзян ПНР. І ўсе мы будзем стварацы яе канкрэтны, матэрыяльны і духовы, воблік. Ад нашай працы, ад нашых пошукаў, ад нашай ініцыятыўнасці будуць залежаць вынікі нашых намераў.

I ёсць у нас асновы да аптымізму. Гаспадарнасць стала нашым дэвізам. Яму ў сваёй дзейнасці партыя адводзіць важную ролю. Ён з'яўляецца таксама рухаючай сілай дзеяння дзяржаўных улад і грамадскіх арганізацый.

Перад асабліва важнай роляй сталі гмінныя, гарадскія, павятовыя і ваяводскія звенні дзяржаўнай улады і адміністрацыі. Умацаванню іх, удасканальванню дзейнасці і пашырэнню правоў і служжаць апошнія змены ў арганізацыі і функцыянаванні рад нарадовых, а таксама дзяржаўнай адміністрацыі ў паветах і ваяводствах. Гэтыя змены пашырылі таксама ролю радных і павінны спрыяць павелічэнню іх аўтарытэту.

Партыя лічыць, што рады нарадовыя і мясцовыя звенні дзяржаўнай адміністрацыі павінны больш паспяхова выкарыстоўваць усе магчымасці дзеля гарманічнага і дынамічнага развіцця краіны, а таксама паасобных рэгіёнаў.

Асабліва неабходна:

- павелічэнне сельскагаспадарчай прадукцыі і харчовай прамысловасці;
- далейшае развіццё дробнай вытворчасці і паслуг для насельніцтва;
- упарадкаванне рознічнага гандлю, гастраноміі, турыстычных паслуг, лепшая арганізацыя адпачынку працоўных і заспакаенне іх культурных патрабаванняў;
- праграма жыллёвага будаўніцтва, мадэрнізацыя гарадоў і вёсак, дбанне аб іх эстэтыцы (ліквідацыя саламяных стрэх);
- лепшая каардынацыя і ўдасканальванне інвестыцыйных працэсаў;
- паслядоўная дзейнасць у пытанні выхавання маладога пакалення ў духу патрыятызму і інтэрнацыяналізму;
- усебаковая дзейнасць у напрамку паляпшэння аховы здароўя грамадства, а таксама арганізацыя лепшай прадухілення хвароб;
- пастаянныя клопаты аб умацаванні сям'і, арганізацыя лепшай дапамогі і апекі над старэйшымі людзьмі.

Неабходна рашуча змагацца з марнатраўствам грамадскай маёмасці і з праявамі бюракратызму, з тэндэнцыямі некаторых звенняў адміністрацыі да аслаблення службэбнай ролі перад грамадствам.

Гэтыя і шмат іншых, не менш істотных заданняў, якія паставіла перад радамі і адміністрацыяй партыя, акрэсліваюць і асаблівае значэнне выбараў. Выбарчы акт, які споўнім 9 снежня, будзе мець вялікі ўплыў на ўмацаванне дзяржавы і фарміраванне сацыялістычных грамадскіх адносін, на стварэнне найлепшых умоў для паслядоўнага ажыццяўлення ўсенароднай праграмы VI З'езду нашай партыі.



Беласток расце ўгару. *Фота Я. Цялушэцкага*

ПРАЗ ТЫДЗЕНЬ У „НІВЕ"

Імем генерала А. Вашкевіча ● Як Цярэшка Калабок заваяваў Польшчу ● Адрынкі ● «Раманс» з Тарашкевічам ● Новае аб Міхалу Федароўскім ● Сукенкі на свята ● Весткі з Палічнай, Старога Корніна, Баб'яй Гары, Гарадка, Гародчыны, Парцава, Азяблаў і інш. ● Песня: „W wojsku nie jest źle".

ПРА ЖНІВО ВОСЕННЮ

Нядаўна пленарнае пасяджэнне павятовага камітэта партыі ў Гайнаўцы было прысвечана жніўнай кампаніі 1973 года.


Цяпер пра жніво?!

Такія пытанні ўзнікалі не толькі ў мяне. Пасля я перакануўся, што мы памыляемся. Пра такую істотную справу ў жыцці вёскі, як уборка збожжа, бульбы і іншых сельскагаспадарчых пладоў, гутарыць ніколі не запозна, ні зарана, бо калі добра ўдумацца, то ніколі невядома, ў які момант гэтая акцыя пачынаецца і калі яна канчаецца. Кожны месяц тут важны. Возьмем хаця б лістапад. Палі апусцелі, усюды сумна і холадна. Але ў лістападзе ёсць час, каб на будучы год падрыхтаваць мінеральныя ўгнаенні, якія цяпер найтаннейшыя. А гэта ў Гайнаўскім павеце справа амаль асноўнага парадку, бо сяляне тут па прымяненню мінеральных угнаенняў усё яшчэ адстаюць ад сваіх сяброў па прафесіі з іншых раёнаў Беласточчыны. Дык ці рыхтуючыся да высакаякаснага ўгнаення поля, не рыхтуемся да жніва?

Жніво ў Гайнаўскім павеце прайшло даволі спраўна, як ніколі дагэтуль. Бачна паправілася спраўнасць і якасць паслуг ў сельскагаспадарчых гуртках і машынна-трактарных базах. Выкарыстанне камбайнаў, снопавязалак і касілак было ў сярэднім двойчы вышэйшае, чым у мінулым годзе. На палях сялян працавала 98 працэнтаў усёй сельскагаспадарчай тэхнікі, якая ў даны момант знаходзіцца на тэрыторыі Гайнаўскага павету. Такой высокай спраўнасці дагэтуль не было.

Працяг на стар. 4

Падзеі ◊ Здарэнні ◊ Факты ◊ Каментарыі ◊ Весткі

 СВЕТ  БССР  ВАЯВОДСТВА 

НА ІНДЫЙСКАЙ ЗЯМЛІ

З выключнай цеплынёй і гасціннасцю сустракала індыйская сталіца Генеральнага Сакратара ЦК КПСС, члена Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. Брэжнева, які прабываў у Індыі з афіцыяльным візітам.

Спецыяльна да прыезду Л. Брэжнева было збудавана звыш пяцісот арак, упрыгожаных гірляндамі жывых кветак. На незлічоных транспарантах на мове хіндзі, рускай і англійскай мовах віднелі надпісы: „Вітаем палымянага барацьбіта за мір, шчырага сябра індыйскага народа“!, „Умацоўваць вузы супрацоўніцтва з дружалюбным савецкім народам“.

Гэтай выдатнай падзеі газеты прысвяцілі спецыяльныя дадаткі. Вядомыя грамадскія дзеячы, дэпутаты парламента, члены ўрада выступілі з артыкуламі, якія падкрэслівалі велізарнае значэнне перагавораў Л. Брэжнева з Індзірай Гандзі для ўмацавання індыйска-савецкіх адносін, умацавання міру і бяспекі народаў. „Візіт Генеральнага сакратара ЦК КПСС, — пісала газета „Нэшнл геральд“, — назавуць гістарычным таму, што такія візіты ствараюць гісторыю“.

Вынікі візіту змешчаны ў супольнай савецка-індыйскай дэкларацыі, падпісанай Л. Брэжневым і Індзірай Гандзі.

ПЕРАВАРОТ У ГРЭЦЫІ

25 лістапада ў Грэцыі адбыўся дзяржаўны пераварот.

Палітычныя назіральнікі даходзяць да вывяду, што пераварот — гэта розыгрыш паміж самімі ваеннымі і па сутнасці карысны для ЗША. Звергнуты прэзідэнт Пападапулас страціў давер сярод значнай часткі камандуючых грэчаскай арміяй па прычыне надання ваеннай дыктатуры выгляду пэўных дэмакратычных свабод.

Новым прэзідэнтам стаў генерал Ф. Гізікас, які з'яўляецца толькі фігурантам. Фактычную ўладу трымае ў сваіх руках начальнік жандармерыі генерал Іанідас.

ПОЛЬШЧА — ГДР

Тавараабарот паміж Польшчай і ГДР у гэтым годзе ўпершыню перавысіць адзін мільярд рублёў і ў адносінах да 1972 года будзе вышэйшы на 25 працэнтаў. Ад пачатку гэтага года і да верасня ГДР наведала 4.800 тыс. польскіх грамадзян, а Польшчу 4.200 тыс. грамадзян ГДР.

У КІТАІ

Віцэ-міністр сельскай гаспадаркі і лясніцтва КНР, прамаўляючы на канферэнцыі ФАО, заявіў, што Кітай у гэтым годзе мае добры ўраджай. Даклад Міжнароднага інстытута стратэгічных даследаванняў ацэньвае, што Кітай у хуткім часе значна пашырыць сваю праграму тэрмаядзернага ўзбраення, і што ў канцы сямідзесятых гадоў будзе мець міжкантынентальныя ракеты і падводныя судны з ракетнай зброяй.

ЗМЯНІЛАСЯ НАЗВА

VII з'езд пісьменнікаў ГДР прыняў пастанову аб змене сваёй назвы. Дагэтуль поўная назва арганізацыі была Германскі саюз пісьменнікаў, а цяпер — Саюз пісьменнікаў Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. (ак)

ФІЛЬМ ПРА РАЗВЕДЧЫКАЎ

У Мінску выйшаў на экраны новы беларускі фільм „Парашуты на дрэвах“. Ён пастаўлены па сюжэтах аднайменнай аповесці Н. Рыдзеўскага (друкавалася ў „Ніве“) і расказвае пра дзейнасць групы савецкіх разведчыкаў, закінутых у час вайны ва Усходнюю Прусію. Аўтар аповесці Н. Рыдзеўскі, які цяпер з'яўляецца журналістам, быў адным з членаў гэтай групы.

ГОМЕЛЬ — У 30 ГАДОЎ ПАСЛЯ ВАЙНЫ

Пад канец месяца лістапада споўнілася трыццаць гадоў з дня вызвалення Гомеля ад гітлераўскіх захопнікаў. У час ваенных дзеянняў гэты старажытны беларускі горад быў амаль цалкам разбураны. Цяпер 330-тысячны Гомель — горад хімічнай і электратэхнічнай прамысловасці, горад машына- і прыборабудаўнікоў. Прадукцыя з маркай гомельскіх заводаў экспартуецца ў 55 краін свету.

У горадзе на рацэ Сож дзейнічае абласны драматычны тэатр, абласная філармонія, 360 калектываў мастацкай самадзейнасці, 4 палацы культуры і 11 клубаў. Вось далёка няпоўная візітная картка Гомеля праз 30 гадоў ад вызвалення.

НОВАБУДОЎЛІ БРЭСТА

Непазнавальна змянілася за апошнія гады ўсходняя ўскраіна Брэста. Тут выраслі карпусы электралямпавага і электрамеханічнага заводаў, будаўнічага інстытута, новы жылы масіў. Ды і цяпер гэты раён нагадвае вялікую будаўнічую пляцоўку. Галоўны аб'ект тут — абласная бальніца. Яна разлічана на 800 ложкаў.

У САЎГАСЕ „КАЛІНАЎКА“...

...што ў Любаньскім раёне, вырас новы рабочы пасёлак. За параўнальна кароткі час пабудаваны тут шматлікія жылыя дамы, сталовая, прамтаварныя і прадуктовыя магазіны, пошта, дзіцячы сад і яслі, адміністрацыйны будынак. У прасторных і светлых дамах жывуць спецыялісты гаспадаркі і рабочыя. У пасёлку закладзен сквер і вялікі фруктовы сад, ствараецца зялёная зона для адпачынку. Шырокае будаўніцтва плануецца на бліжэйшую будучыню. Будзе ўзведзены клуб на 500 месц, камбінат бытавога абслугоўвання і шмат іншых будынкаў. У саўгасе „Калінаўка“ ўжо цяпер можна наглядаць як вёска набліжаецца да форм гарадскога жыцця.

У ГОНАР ПІСЬМЕННІКА

Вядомы беларускі пісьменнік Піліп Пестрак з'яўляецца чалавекам блізкім нашаму сэрцу. Таму мы ўжо адзначалі яго 70-годдзе на старонках „Нівы“. Прыемна нам паведаміць нашым чытачам, што ў БССР юбілей Дзядзькі Піліпа адзначалі вельмі ўрачыста. 26 лістапада гэтага года ў клуб Саюза пісьменнікаў БССР у Мінску прыйшлі віншаваць юбіляра яго сабраты па пяру, а таксама рабочыя прадпрыемстваў і будоўляў, студэнты мінскіх вышэйшых навучальных устаноў, мастакі і артысты. Аб жыцці і творчым шляху Піліпа Пестрака расказаў удзельнікам вечара пісьменнік Алесь Кучар. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў пісьменніка Ганаровай граматай. (вр)

З НАГОДЫ „БАРБУРКІ“

У Любіне — сталіцы польскай медзі — пабывалі І сакратар ЦК ПАРП Э. Герэк і прэм'ер П. Ярашэвіч. Яны пазнаёміліся з ходам працы на новабудаваных шахтах медзі і сустрэліся з шахцёрскім актывам. Выступілі Э. Герэк і П. Ярашэвіч, дзякуючы рабочым за працу і жадаючы далейшых поспехаў у разбудоўванні любінскага меднага басейна.

МОСТ ЛАЗЕНКОЎСКІ

Прадпрыемства „Мастасталь“ — будаўнікі мосту на Лазенкоўскай трасе ў Варшаве — датрымала тэрмін і пракла-ла праз Віслу мост. Мост гэты праклад-ваўся наступным чынам: спачатку на зямлі была змантавана 1200-тонная канструкцыя мосту на абодвух баках ракі, а потым яе насоўвалі, аж пакуль не спалучыліся абедзве часткі, і мост стаў на моцнай аснове. Насоўванне мосту працягвалася 3 дні.

ДЭЛЕГАЦЫЯ РЭСПУБЛІКІ ПАЎДНЁВАГА В'ЕТНАМА

Па запрашэнню старшыні Рады Дзяржавы ПНР з афіцыяльным візітам у нашу краіну прыехала дэлегацыя Рэспублікі Паўднёвага В'етнама на чале са старшынёй Дарадчага Савета Часовага Рэвалюцыйнага Урада Рэспублікі Паўднёвага В'етнама — Нгуен Гу То. Патрыятычныя сілы Паўднёвага В'етнама, дэлегацыя якіх пабывала ў Польшчы, кантралююць 4/5 тэрыторыі Паўднёвага В'етнама.

ЭНРЫКА БЕРЛІНГУЭР У ПОЛЬШЧЫ

Па запрашэнню Палітбюро ЦК ПАРП у Польшчу прыехаў з візітам дружбы Энрыка Берлінгуэр — генеральны сакратар ЦК Італьянскай камуністычнай партыі. З госцем сустрэўся Э. Герэк. Доўгая і сардэчная размова адбылася ў будынку ЦК ПАРП.

ПРАЕКТ КОДЭКСУ ПРАЦЫ

На сваім пасяджэнні Рада Міністраў з удзелам прадстаўнікоў ЦРЗЗ зацвердзіла праект кодэксу працы, падрыхтаваны ўрадам і ЦРЗЗ на аснове дырэктываў партыі. Кодэкс упарадкуе і ўнармуе з юрыдычнага боку комплекс спраў, звязаных з працай, акрэсліць асноўныя нормы працы. Рада Міністраў вырашыла прадставіць праект Сейму.

ГІСТОРЫЯ ПОЛЬСКАГА РАБОЧАГА РУХУ

Ідзе праца над шматтомнай гісторыяй польскага рабочага руху. У сувязі з гэтым у Вышэйшай школе грамадскіх навук (ВСНС) пры ЦК ПАРП адбылася сустрэча вучоных-гісторыкаў, якія прадыскутавалі спадчыну ППР.

СУПРАЦОЎНІЦТВА ПОЛЬШЧА — ГДР

У Варшаве адбылася XIII сесія Камітэта гаспадарчага і навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва паміж ПНР і ГДР. Былі падпісаны супольныя гаспадарчыя ўмовы. Напр. на тэрыторыі ГДР будзе будавацца супольная фабрыка высакаякасных кармоў.

НАЙБОЛЬШАЕ ДАСЯГНЕННЕ ПОЛЬСКАЙ НАВУКІ

„Трыбуна Люду“ аб'явіла ў Годзе Польскай Навукі плебісцыт пад лозунгам „10 найбольшых дасягненняў навукі ПНР“. Прыйшло 21.337 адказаў. З 10 найбольшых дасягненняў чытачы прызналі першае месца дасягненню ў медыцыне (новыя метады аперацыйнага лячэння). (вл)

ТАВ. С. КАНЯ НА БЕЛАСТОЧЧЫНЕ

28 лістапада на Беласточчыне прабываў сакратар ЦК ПАРП Станіслаў Каня. Разам з І сакратаром ВК ПАРП З. Куроўскім і І сакратаром ГК Р. Жукоўскім тав. Каня наведаў Чыгункавае прадпрыемства стальных канструкцый (КЗКС) у Старасельцах. Сакратар ЦК пабываў у цэхах, цікавіўся профілем вытворчасці і дасягнутымі вынікамі, перспектывамі прадпрыемства, сацыяльнымі ўмовамі рабочых і інш. Затым тав. Каня сустрэўся з актывам прадпрыемства.

Вечарам госць аглядаў новыя аб'екты Беластока, а пасля адбылася сустрэча з палітычным актывам у Ваяводскім камітэце партыі.

ВІЗІТ МІНІСТРА

Пабываў таксама на Беласточчыне міністр будаўніцтва і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў А. Каркошка і віцэ-міністр таго ж міністэрства Я. Анушэўскі. На сустрэчы ў Ваяводскім камітэце партыі ў прысутнасці сакратараў ВК ПАРП, старшыні Прэзідыума ВРН Е. Зентары абмяркоўваліся задачы, пастаўленыя перад будаўнікамі на 1974 год, а таксама развіццё будаўніцтва ў нашым ваяводстве ў наступнай пяцігодцы.

„КУРПЯМ“ — 20 ГОД

Калектыву песні і танца, які існуе пры Ваяводскім доме культуры, споўнілася 20 год. З гэтай нагоды адбылася сустрэча членаў мастацкага калектыву з уладамі ваяводства. Старшыня Прэзідыума ВРН З. Спрыха ўручыў адзінаццаці шматгадовым членам калектыву ганаровыя адзнакі „Заслужаны для Беласточчыны“. Супольную такую адзнаку калектыў атрымаў ужо раней. Цяпер калектыву ўручаны былі спецыяльныя пахвальныя дыплом і грашовая ўзнагарода. На сустрэчы быў зачытаны віншавальны ліст І сакратара ВК ПАРП З. Куроўскага, адрасаваны да калектыву.

2 і 3 снежня ў тэатры імя А. Вянгерскі адбыліся юбілейныя канцэрты.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

Беластоцкая спулдзельня працы „Взорцова“ інтэнсіўна аднаўляе сваё абсталяванне, пераходзячы на самыя сучасныя машыны. Вырабы нашай спулдзельні павінны быць цяпер самай высокай якасці, бо „Взорцова“ падпісала ўмову з аўстрыйскай фірмай „Фэліна“. Фабрыкі гэтай фірмы знаходзяцца амаль ва ўсіх краінах Еўропы, а вырабы карыстаюцца вялікім поспехам на еўрапейскім рынку.

Супрацоўніцтва беластоцкай спулдзельні з фірмай „Фэліна“ будзе заключацца ў тым, што спулдзельня наша будзе атрымоўваць ад фірмы сыравіну, фасоны, тэхналогію і неабходныя машыны. А спулдзельня будзе шыць навейшых крояў бюстгалтары. Прадстаўнікі венскай фірмы цяпер інструктуюць калектыў спулдзельні, а пазней, калі спулдзельня пачне выконваць заказы фірмы, будуць утрымліваць з ёй сталы кантакт. Першы заказ — гэта 165 тыс. бюстгалтараў. (яч)



Niedziela — 9.XII.73

7.00 Program dnia. 7.05 TV Kurs Rolniczy. 7.40 Przypominamy, radzimy. 7.50 Nowoczesność w domu i zagrodzie. 8.10 Gra Orkiestra Dęta XII Dywizji Zmechanizowanej im. Armii Ludowej. 8.40 Dziennik. 9.00 „TELERANEK”. 10.20 „Gujana kraina wód” — „Noc w dżungli” — film dok. TV Szwedzkiej. 10.50 Utwory ze znakiem Standard — gra orkierstra TV Katowice. 11.10 W starym kinie — „Niemowlęce lata kina”. 12.00 Dziennik. 12.15 Koncert Przyjaźni. 13.00 Przemiany. 13.30 „Piórkiem i węglem”. 14.00 Dla dzieci: „Co to jest ” — konkurs zabawa. 14.40 „My — 74” — teleturniej. Walczą Gdańsk i Kraków. 15.40 Losowanie Totolotka. 16.15 „Gratulujemy”. 17.00 Tele — Echo. 18.00 Puchar Interwizji w gimnastyce artystycznej (z Mielca). 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.20 „Życie rodzinne” — film fab. polski. 21.50 PKF. 22.00 „Dobry wieczór — tu Łódź”. 22.50 Dziennik. 23.00 Magazyn sportowy.

Poniedziałek — 10.XII.

12.45 TV Technikum Rolnicze —Matematyka. 13.25 TV Technikum Rolnicze — Uprawa roślin. 16.15 Program dnia. 16.20 Telereklama. 16.30 Dziennik. 16.40 „Zwierzyniec”. 17.30 Echo stadionu. 17.55 TV Kurier Kielecki. 18.10 Oferty. 18.25 Kronika Warszawy i Mazowsza. 18.45 Eureka. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 Teatr TV: Erskine Caldwell „Jenny”. 22.05 Spotkanie z pisarzem. 22.35 Dziennik. 22.50 Śpiewa Andrzej Mróz. 23.10 Wiadomości sportowe i sprawozdanie z międzynarodowych zawodów w jeździe figurowej na lodzie.

Wtorek — 11.XII.

8.00 „Zdradziecki list” — film franc. — V odc. („Pani de Monsoreau”). 9.00 Dla szkół: (kl. I lic.) Język polski. W. Szekspir „Makbet”. 10.00 Dla szkół: (kl. IV) „Maria Konopnicka”. 15.20 TV Technikum Rolnicze — Matematyka. 15.55 TV Technikum Rolnicze — Uprawa roślin. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Rodzina Durtolów” — film franc. — XIII odc. 17.05 „Druga młodość Gdyńskiej Stoczni” („Morskie spotkania”). 17.35 „Oj, Dzikowianie jadą” — widowisko regionalne. 17.55 Dla młodzieży: Spotkanie z Ernestem Bryllem. 18.20 Telereklama. 18.25 Kronika Warszawy i Mazowsza. 18.45 Dla młodzieży: Korepetycje muzyczne. 19.15 Przypominamy, radzimy. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Zdradziecki list” — film franc. — odc. V („Pani de Monsoreau”). 21.10 Interstudio. 21.45 „Pani Fafuła na Wystawie Paryskiej” — wodewil wg F. Schobera. 22.45 Dziennik. 23.00 Wiadomości sportowe.

Środa — 12.XII.

8.00 Film. 9.00 Dla szkół: (kl. VII) Chemia. „Mieszanina a związek chemiczny”. 10.00 Dla szkół: (kl. VII) Fizyka. „Grawitacja i loty kosmiczne”. 11.05 Dla szkół: (kl. VII) Historia. „Za wolność Waszą i naszą”. 12.45 TV Technikum Rolnicze — Fizyka. 13.25 TV Technikum Rolnicze — Botanika. 15.40 Program dnia. 15.45 Dla dzieci: „Dźwięki i czary” — cz. IV. 16.10 Informacje — Towary — Propozycje. 16.25 Transmisja meczu piłki nożnej III-ciej rundy Pucharu UEFA: Ruch (Chorzów) — Honved (Budapeszt). 18.10 Losowanie Małego Totka. 18.25 Kronika Warszawy i Mazowsza. 18.45 Za kierownicą. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Nowak — show czyli Zmarnowane życie”. 21.05 Kontakty. 21.35 Filmoteka Arcydzieł: „Miłość blondynki” — film fab. czechosł. 23.00 Dziennik. 23.15 Wiadomości sportowe i sprawozdanie z międzynarodowych zawodów w jeździe figurowej na lodzie (tańce).

Czwartek — 13.XII.

8.35 „Akcja Saturn” — cz. I — film fab. radz. 10.00 Dla szkół: (kl. VI) Historia. „Życie królewskiego dworu”. 11.05 Dla szkół: (kl. VII) Język polski. „Adam Mickiewicz”. 13.30 TV Kurs Informatyki: „Optymalizacja obliczeń”. 14.00 Matematyka w szkole: „Łamane w sieci kwadratowej”. 15.20 TV Technikum Rolnicze — Fizyka. 15.55 TV Technikum Rolnicze — Botanika. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Ekran z bratkiem”. 17.45 PKF. 17.55 „Melodie z Jugosławii”. 18.25 Kronika Warszawy i Mazowsza. 18.45 Poligon. 19.10 Przypominamy, radzimy. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Akcja Saturn” — cz. I — film fab. radz. 21.40 Przy wspólnym stole. 22.25 „Golibroda” nr 3. 22.55 Dziennik. 23.10 Wiadomości sportowe.

Piątek — 14.XII.

8.30 „Martwa fala” — film fab. pol. 10.00 Dla szkół: (kl. VI) Geografia. „W Tatrach”. 11.05 Dla szkół: (kl. II) „W leśniczówce”. 12.00 Dla szkół: (kl. VIII) Wychowanie obywatelskie. „Dowód najwyższego uznania”. 12.45 TV Technikum Rolnicze — Chemia. 13.25 TV Technikum Rolnicze — Hodowla zwierząt. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Pora na Telesfora”. 17.25 Nie tylko dla pań. 17.50 Dla młodzieży: Tygodnik Informatyki Młodych i „Dwie szkoły” — telekonkurs. 18.25 Kronika Warszawy i Mazowsza. 18.45 Dialogi historyczne (Wydanie specjalne). 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 Śpiewa Tony Craig. 20.45 Panorama. 21.[illegible]5 Teatr TV: „Listy z morza” wg A. Perepeczki. 22.25 Informacje — Towary — Propozycje. 22.40 Dziennik. 22.55 Wiadomości sportowe i sprawozdanie z międzynarodowych zawodów w jeździe figurowej na lodzie.

Sobota — 15.XII.

8.00 „Profesor na drodze” — film fab. TVP. 9.00 Dla szkół: (kl. V) Geografia. „Gdzie cytryna dojrzewa...”. 10.00 Dla szkół (kl. VII) Zoologia. „Świat owadów”. 14.20 TV Technikum Rolnicze — Chemia. 14.55 TV Technikum Rolnicze — Hodowla zwierząt. 15.25 Program dnia. 15.30 Program I proponuje. 15.50 Redakcja szkolna zapowiada. 16.05 TV Informator Wydawniczy. 16.30 Dziennik. 16.40 Dla młodzieży: „Nasz przyjaciel” — film fab. radz. 17.45 Dla młodych widzów: „Rok nowy i nieznany”. 18.10 Wychowanie fizyczne receptą na zdrowie. 18.35 Pegaz. 19.20 Dobranoc. 19.30 Monitor. 20.15 „Profesor na drodze’ — film fab. TVP. 21.15 Teatr Rozrywki: W. Katajew „Zaciszny pensjonat”. 22.15 Dziennik. 22.30 Wiadomości sportowe. 22.40 „Canzonissima” — włoski program rozrywkowy.



Piątek, 7 grudnia

7.45 Film fab. 15.25 Program dnia. 15.30 Eureka. 16.40 Świat socjalizmu. 17.15 Program muzyczny. 17.45 Film fab. 19.00 Czas. 19.30 Film muz. 20.35 Program sportowy. 21.15 Koncert estradowy. 21.45 Panorama nowin.

Sobota, 8 grudnia

7.00 Program dnia. 8.00 Przegląd międzynarodowy. 9.15 Film fab. 10.55 Białe i czarne. 12.00 Komedia filmowa. 13.20 Film dokument. 15.00 Filmy animowane. 15.30 Piosenka — 73. 16.10 Film fab. 17.15 Film muz .17.40 Spektakl teatralny. 19.00 Czas. 19.30 c.d. spektaklu. 20.30 Program sportowy.

Niedziela, 9 grudnia

7.00 Program dnia. 9.00 Spektakl TV. 9.35 Film pop.-naukowy. 9.45 Kiosk muzyczny. 10.15 Stadion TV. 11.15 Śpiewa Fiłatowa. 11.45 Film fab. 13.00 Koncert zespołu tanecznego. 14.00 Panorama międzynarodowa. 14.30 Filmy animowane. 15.00 Klub filmowy. 16.40 Film fab. 17.30 Wieczór autorski A. Nowikowa. Transmisja z Sali Kolumnowej. 19.00 Czas. 19.30 c.d. transmisji z Sali Kolumnowej. 20.30 Program sportowy.

БГКТ хроніка

■ Нядаўна ў Сямяціцкім павеце адбыліся справаздачныя сходы гурткоў БГКТ у Нурцы-вёсцы, Нурцы-станцыі, Вычулках, Клюковічах і Мікулічах.

■ Падобныя справаздачныя сходы адбыліся ў Гарадку і Рыбаках у Беластоцкім павеце.

■ 21 лістапада беларускі калектыў песні і танца „Белавежа" з Белавежы выступіў з канцэртам у Гайнаўцы.

■ 21 лістапада стварыўся новы гурток БГКТ у Коматаўцах. На арганізацыйны сход прыбыло 15 чалавек. Сакратар праўлення беластоцкага павятовага аддзела Геня Іванюк пазнаёміла прысутных са статутам БГКТ, з заданнямі і роляй Беларускага таварыства. Падпісаўшы членскія дэкларацыі, прысутныя выбралі праўленне гуртка: Анна Севасцьянік (старшыня), Лідзія Стрымко і Яўгенія Мікуць.

■ На справаздачна-выбарным сходзе ў Баброўніках (23.XI.), пасля абмяркоўкі працы гуртка, прысутныя выбралі новага старшыню — Зофію Цацэрка.

■ У Скрабляках справаздачна-выбарны сход гуртка БГКТ прыняў 13 новых членаў і выбраў новае праўленне, у якое увайшлі: Павел Тамашэвіч, Яўгень Кудзель, Леакадзія Налівайка і Марыя Тамашэвіч.

■ На выязным пасяджэнні прэзідыума ГП БГКТ у Гайнаўцы (23.XI.) у прысутнасці членаў прэзідыума тамашняга аддзела праведзена была ацэнка дзейнасці Гайнаўскага аддзела ў 1972—1973 гадах. Была яна ў асноўным станоўчая. На гэтым жа пасяджэнні Прэзідыум ГП зацвердзіў: 1) структуру пасад і зарплаты штатных працаўнікоў БГКТ у сувязі з пастановай № 13 Міністэрства ўнутраных спраў, 2) правілы фестывалю харавых калектываў БГКТ, адбудзецца ён у красавіку 1974 года, 3) рэдактара беларускага календара на 1975 г., будзе ім Мікалай Гайдук, 4) кандыдатуры да ўзнагарод за арганізацыю і правядзенне конкурсу на беларускую песню ў 1973 годзе. А вось іх прозвішчы: бельскі аддзел БГКТ — Сяргей Лукашук, Людміла Васілюк, Вера Рышчук і Ольга Пракапюк, беластоцкі павятовы аддзел БГКТ — Анна Кузьміцкая, Ніна Мушынская, Зофія Цацэрка і Люба Лукашэвіч, гайнаўскі аддзел БГКТ — Аляксандр Лукашук, Тамара Бусняк, Славамір Місеюк, Генрыка Чарнецкая і Ніна Леўчук, сямяціцкі аддзел БГКТ — Вера Манцюк, Сяргей Крэйза і Кастусь Пытлюк. У гэтым пасяджэнні прынялі ўдзел таксама прадстаўнік МСВ Вальдэмар Вінярскі і ВК ПАРП — Аляксандр Сеўка, а таксама прадстаўнікі аддзелаў унутраных спраў Прэзідыума ПРН у Гайнаўцы Кастусь Бяляўскі і Прэзідыума ВРН — Анатоль Несцяровіч.

■ Пленарнае пасяджэнне сакольскага аддзела БГКТ (23.XI.) абмеркавала дзейнасць гурткоў БГКТ, далейшыя напрамкі працы, а таксама арганізацыйныя справы, звязаныя з справаздачнай кампаніяй у гуртках БГКТ і аплочваннем членскіх складчын.

НА ВАРШАЎСКАЙ

ВЕЧАР З Янам ГУШЧАМ

Гэтай сустрэчы мы чакалі даўно. У беларускім клубе на Варшаўскай адбыўся вечар з Янам Гушчам, сябрам і папулярызатарам беларускай літаратуры.

Ян Гушча, знаны польскі пісьменнік, пражывае ў Лодзі і тут ад пасляваеннага перыяду ўзбагачае польскую літаратуру. Выдаў больш чым 30 кніжак.

Але кніжка гэта не вексель, як гаворыць сам аўтар, змяняецца погляд на яе не толькі ў чытача, але і ў аўтара. Калі глядзіш на іх загалоўкі, дык часам здаецца, што шмат чаго змяніў бы ў іх, а некаторыя нават выключыў бы з абароту.


Што датычыць Яна Гушчы, дык можна смела сказаць, што гэта пісьменнік-„многаварштатовец" — піша вершам і прозай, а ў апошнім часе зацікавіўся перакладамі, не перастаючы, зрэшты, пісаць далей.

Перакладчыцкую працу Гушча распачаў яшчэ ў Вільні, будучы студэнтам. Быў гэта верш Анны Ахматавай. Пісьменнік успамінае, што тады Галчынскі сказаў, што гэтага верша нельга перакласці, ён не паддаецца перакладу, бо цяжкі. Гушча зрабіў пераклад... Потым пераклаў два ці тры вершы беларускіх паэтаў, якія друкаваліся ў даваенным польскім друку.

У 1968 годзе вяртаўся з паездкі ў Азербайджан. Па дарозе затрымаўся ў Мінску і Вільні. Асабліва захапляўся паэзіяй Максіма Багдановіча. Плёнам гэтай пабыўкі быў пераклад беларускіх вершаў, надрукаваных пазней у варшаўскім часопісе „Паэзія". Чарговая сустрэча з беларускімі літаратарамі адбылася ў Польшчы ў 1969 годзе з нагоды з'езду пісьменнікаў. Плёнам гэтай сустрэчы была „Анталогія беларускай паэзіі", зрэшты, першая ў Польшчы, да якой падборку зрабілі Янка Брыль і Ян Гушча.

Зараз беларуская літаратура ў Польшчы мае добры перыяд, гаварыў на вечары Гушча, а яшчэ сказаў, што Лодзінскае выдавецтва падрыхтавала да друку шэраг беларускіх твораў. Пад рэдакцыяй Ігара Сікірыцкага выйдзе зборнік вершаў Максіма Танка, які мае быць спробай паказання польскаму чытачу поўнай творчасці гэтага вялікага паэта. У выдавецтве складзены таксама том сучасных апавяданняў беларускіх празаікаў, падборку якіх і пераклад зрабіў Ян Гушча. Неўзабаве паявіцца ў кнігарнях выбар паэзіі Максіма Багдановіча пад рэдакцыяй Я. Гушчы.

Вечарам на Варшаўскай Ян Гушча з натхненнем чытаў вершы беларускіх паэтаў у



Ян Гушча ў клубе на Варшаўскай.

перакладзе на польскую мову, якія дагэтуль не друкаваліся. Асабліва многа месца прысвяціў ён творчасці М. Багдановіча і М. Танка.

Хочацца верыць, што была гэта першая сустрэча з распаўсюджвальнікам беларускай літаратуры, але не апошняя.

Тэкст і фота А. Карпюка

ЛЁН, ТЫ МОЙ ЛЁН...

Сёння ў дзверы застукаў пісьманосец.

Сястра мая, Маня, што засталася на гаспадарцы, запрашала мяне ў госці, хоць адну нядзельку, пісала, пажывеш у мяне. А праўда, даўно ўжо, мо год я не наведвала сваёй радні. Вядома, далёка са Шлёнска на Бельшчыну, ды і часу ўсё мала: вучоба і праца, праца ды вучоба...

І вось той радасны момант. Я саджуся на цягнік, і сэрца маё моцна б'ецца.

Да самай Варшавы ўсё думала, успамінала... Бульбу ж ужо выкапалі, можна будзе пагаварыць, і хаця лён церці якраз пара, то ўсё ж больш часу знойдзецца, чымсьці летняй гарачай парою...

— Вось і Варшава! Якая прыгожая, з кожным годам прыгажэйшая, а вось і Лазенкоўская траса! Проста цудоўная!

Заняла месца ў купэ цягніка Варшава — Беласток. Перада мною амаль чатыры гадзіны дарогі. Абаперушы галаву аб сценку купэ, я заплюшчыла вочы...

*

Дзверы ў сенцах моцна стукнулі, відаць, гэта Надзя Дзямідава спяшаецца да нас. Яна так заўсёды.

— Дзе Маня? — спытала, задыхаўшыся.

Мая сястра хуценька саскочыла з высокай печы (бо запека ў нас не было, вядома, бацька добры і шанаваны столяр). Я аднак засталася на печцы, бо печка цёпленькая, мама сёння рана напаліла, каб высушыць лён, бо вечарам будзем церці.

Урыўкі з размовы Надзькі з Маняй даходзілі і да мяне на печку. Надзя запрашала на сёння дзяўчат церці лён. Вядома, у кампаніі дык і работа перуном ляціць. Маня трохі адмаўлялася, тлумачачыся паломанай церніцай, але Надзя налягала:

— Пакінь ты сваю церніцу, у нас будзе адна незанятая, бо мама ў клуні будзе трапаць ды часаць лён, а мы ўсе памесцімся ў старым хляве, я ўжо падрыхтавала дзве газоўкі і будзем „ляскаць" хоць цэлую ноч.

Калі пачало вечарэць, Маня схапіла ў плахту цэлае бярэмя сухога ільну з печы і, будучы ўжо ў дзвярах, крыкнула да мяне: „Вечарам прынясі мне яшчэ бярэмя, бо напэўна будзе замала", — і знікла за дзвярыма.

Надзя жыла недалёка ад нашай хаты, і лясканне церніц ды рогат дзяўчат і хлопцаў не давалі мне забыцца аб загадзе сястры. Калі я прынесла лён, Маня якраз кончыла сваю работу, абаперлася на церніцу і прыгожым тоненькім галасочкам зацягнула:

Пасадзіла огурочкі...

Усе падхапілі хорам і песня панеслася па вёсцы. Я, ужо сонная, узяла мяхенькія скруточкі сцёртага ільну і пацягнулася дахаты.

Мама хваліла сёлетні лён, ды дзяліла:

— Вось гэты будзе на ручнікі, добра яго выбялім на сонейку і будзе на сарочкі, беленькія ды тоненькія, як да шлюбу, а вось той спрадзем на плахты ды мяшкі...

Хтосьці пацягнуў мяне за рукаў, і я адкрыла вочы.

— Ужо Беласток, пані! — крыкнула мне спадарожніца, баючыся, каб я не праспала.

На дворы ўжо шарэла, калі я ўвайшла ў хату сястры. Прывітанням не было канца. Сястра падрыхтавалася да майго прыезду, як да гасціны. Папілі мы, паелі, пагаварылі, але спаць не пайшлі — па тэлевізару ішоў амерыканскі вестэрн, і сям'я прысела ля экрана. Толькі я, стомленая падарожжам, улезла ў ванну поўную цёплай вады, памылася і апрануўшы нейлонавую кашульку маёй сястры, хуценька ўсунулася пад пуховую коўдру. Бабчына льняная прасціна прыемна запахла, і невядома калі я заснула. Хоць на дварэ было ціха-ціха, мне сніўся стукат церніц ды гоман моладзі. Відаць, была страляніна ў тэлевізары...

Н. Андрэюк



НАШЫЯ СЯБРЫ

ВАСІЛЬ БІЛЬКЕВІЧ

Чатыры гады носіць пісьмы, газеты і розныя пасылкі пісьманосец ВасільІлькевіч з Чыжоў Гайнаўскага павету. Абслугоўвае ён вёскі Чыжы, Збуч, Ракавічы, Асоўку. Мае каля 400 падпісчыкаў, у тым ліку 115 падпісчыкаў на „Ніву". У раёне яго абслугоўвання найбольш прэсы чытаюць Кацярына Давідзюк са Збуча, Тамара Іванюк з Асоўкі і Эльжы Ахрымюк з Чыжоў. Кожны з іх мае прынамсі квартальныя падпіскі.

ВасільІлькевіч мае добрыя вынікі ў падпісцы на партыйную і сельскагаспадарчую прэсу. Найбольш чытаюць „Хлопскую Дрогу" — 120 экземпляраў. Чыжоўскі пісьманосец атрымаў нават узнагароду ад рэдакцыі „Хлопскай Дрогі". У сваю чаргу рэдакцыя „Нівы" ўзнагародзіла Васіля Бількевіча таксама рэчавай узнагародай.

Варта сказаць, што ў цэлай акрузе хваляць В. Бількевіча за тэрміновае даручэнне пасылак, за ветлівасць і сумленнае выкананне сваіх службовых абавязкаў.

Тэкст і фота Я. Ц.

ЛІСТ З Задрыпанкі

ГАПКА АДКРЫВАЕ БАРСКАГА

Погалас, што Гапка складае пахвальныя частушкі пра начальніка, дакаціўся да гміны, і ўжо ў першым публічным выступленні начальнік прыкмеціў мясцовых творцаў („Нашай увагі заслугоўваюць народныя таленты, якія натхнёнай творчасцю ствараюць спрыяльны клімат для новых пераўтварэнняў у нашай гміне").

Поспех акрыляе, і, відаць, Гапка на дасягнутым не спыніцца: пачала вывучаць „Белавежу", асабліва Барскага.

Што ён Гапку зацікавіў — не дзіва, але ці вывядзе яе з нетраў сучаснай паэзіі?

Чарговы літаратурны вечар, якія Гапка пачала наладжваць:

— Барскі звярнуўся да Дарвіна з просьбай замяніць яго ў малпу:

Дарога да цябе — нялёгкая дарога
працу я Дарвіна
змяні мяне ў абяз'яну
майму каханню хтось падставіў ногу
і дрэва майго шчасця ў сэрца раніў
бяда ў тым што ўсё я разумею
мне лепш было б
тупым і безразумным
каб востры вецер
твар тупы абвеяў
мне дзікаму дурному гуну
табе дзяўчына
дзякую за боль мой
ён дарагі мне так як боль і радасць
ты вольная
і я таксама вольны
на брак кахання няма рады

Чуў?

— Чуў, ды Дарвін тут ні пры чым. Ніколі ён не быў цудатворцам.

— Дык можа стаў?

— Хто?

— Дарвін.

— Гапка, ці часам і ты не хочаш перабрацца на дрэва?.. Гэта ў яго такая фантазія.

— У Дарвіна?

— У Барскага.

— Аднак той Дарвін не малая шышка, калі без яго вучоныя людзі не могуць здзейсніць сваіх фантазій... Дастаць бы мне яго адрас...

— У Задрыпанцы малпін гай стварыла б?!

Гапка назвала мяне тупым гунам і, працытаваўшы Барскага („Дарога да цябе — нялёгкая дарога..."), пачала пісаць першае ў сваім жыцці пісьмо да паэта:

„Дарагі наш пясняр! Піша да цябе Гапка Задрыпанская. Акажы ласку і не прымі маіх слоў за дрэнную манету. Веру, што ў цябе дарога да шчасця нялёгкая, і таму паганцу, што табе падставіў нагу, хай вочы скосяцца, але ці ж трэба з-за адной падножкі ўзбірацца на дрэва і выстаўляць гладкі твар на востры вецер? Плюнь ты на draўлянае шчасце, і калі маеш доступ да цудатворца Дарвіна, папрасі ў яго для нашай вёскі святліцу: будзе і задрыпанцам радасць, і табе. Не выклікай ваўка з лесу: гунаў і іншага дзікунства ў нас удосталь! Прасі святліцу..."

Вось табе і Гапка! Сапраўды, чым з'яўляецца боль паэта („На брак кахання няма рады") у параўнанні з бракам у Задрыпанцы святліцы? Тут, калі бязрадна сціснеш плячыма — грош табе цана. Тут патрэбны характар...

Добрая Гапка, а я падазраваў цябе чорт ведае ў чым!

Але вобраз гойсаючага па дрэвах паэта не пакідаў нас і мы закончылі свой літаратурны вечар рэзалюцыяй: з мэтай наближэння літаратуры да вёскі запрасіць Барскага ў Задрыпанку. Хай нас вывучае. Мо тады і адкліча сваю дробязную заяву Дарвіну?

Ваш Даніла



Пачатак на стар. 1

Пра жніво восенню

Гаворачы аб найлепшых, аб тых, хто асабліва самаахвярна памагаў сялянам, трэба сказаць пра кіраўніцтва і амаль цэлыя калектывы:

— міжгуртковскіх машынна-трактарных баз у Курашаве, Кляшчэлях, Саках, Моры і Махнатым;

— сельскагаспадарчых гурткоў з Навасадаў, Палічнай, Гарадочна, Дубін, Лянева, Жукоў і Міклашэва;

— вясковых спулдзельняў прадукцыйных у Васьках, Старакорніне, Макаўцы і Тыневічах;

— ПГР у Новаберазове і ПОМ у Нарве.

На падзяку і пахвалу павятовага камітэта партыі заслужыла сельскагаспадарчая служба Кляшчэлеўскай і Дубіцкай гмін, а перш за ўсё таварышы **Малец, Якубоўскі і Чыквін.** Ахвярна і паспяхова кіравалі жніўнай кампаніяй і ўборкай земляплодаў намеснік старшыні прэзідыума ПРН у Гайнаўцы тав. **Вацлаў Цэглярскі** і намеснік старшыні павятовага саюза сельскагаспадарчых гурткоў тав. **Здзіслаў Мінакоўскі.**

Актыўна працавалі маладыя хлебаробы, аб'яднаныя ў гуртках Саюза сацыялістычнай вясковай моладзі. Як штогод, многія з іх прынялі ўдзел у акцыі „Кожны колас на вагу золата". Тут асабліва адзначаліся гурткі ЗСМВ з Міклашэва і Махнатага.

Пра добрую работу і арганізацыйны ўздым гаворыць таксама і тое, што ў час мінулай жніўнай акцыі рады партыйных арганізацый ва ўстановах і на прадпрыемствах, якія абслугоўваюць сялян, папоўніліся больш чым на 50 новых кандыдатаў у члены ПАРП.

Прыемна і нам пахваліць людзей за добрую працу. Аднак трэба ўказаць пальцам і тых, хто на пахвалу не заслужыў. У Трасцянцы, Новаберазове, Ставішчах, Ляўкове, а таксама ў арэшкаўскай міжгуртковай машынна-трактарнай базе не змаглі на час адрамантаваць усёй тэхнікі, не задбалі, каб кожны трактар меў свайго вадзіцеля, нядбайна распрацавалі планы выкарыстання машын. У вясковых крамах выступаў недахоп найбольш патрэбных тавараў. ГС-ы не змаглі забяспечыць сялян дастатковай колькасцю мяшкоў, што тармазіла скупку бульбы, а гаспадары непатрэбна трацілі час на чаканне ў чарзе на скупачных пунктах.

У гмінах Чыжы, Нараў і Гайнаўка недастаткова паклапаціліся пра тое, каб наладзіць дапамогу гаспадарам, якія не змаглі на час управіцца з уборкай.

І таму пасыпаліся заўвагі, папярэджанні, а нават службовыя пакаранні. Гэта па прынцыпу, што цярпець нядбайнасць шкодна і нельга.

У зале сабраліся тады людзі, якія ў шматзначнай ступені кшталтуюць цяпер аблічча Гайнаўшчыны. Гэта ж актывісты, давераныя прадстаўнікі партыйных арганізацый. Дык сядзелі, слухалі і тое, што чулі, прымервалі да свайго асабістага становішча, да таго, што і як будуць рабіць праз месяц, ці праз паўгода, якія прадпрымуць намаганні, каб наступнае жніво і ўборка земляплодаў прайшлі яшчэ спраўней, каб праз год у час падобнай ацэнкі не апынуліся яны ў спіску гультаяватых і нядбайных, каб заслужыць на пахвалу.

А трэба ведаць, што заданні ўсё ўзрастаюць. Гайнаўшчына намагаецца дагнаць найлепшых у ваяводстве. Дзеля гэтага трэба напружваць усе сілы. Між іншым, неабходна прынамсі ўтрымаць на дагэтуляшнім узроўні тэмпы прыросту ўраджайнасці і развіцця жывёлагадоўлі.

Дык добра, што пра жніво гавораць у Гайнаўцы ўжо восенню, што распрацоўваюць канкрэтныя заданні для вясковых і гмінных партыйных і грамадскіх арганізацый. Гэта абнадзейвае.

Максім Нурэцкі

Беларускія кнігі

У кнігарні імпартных выданняў у Беластоку, вул. Кілінскага 10, можна набыць наступныя кнігі на беларускай мове:

Тлумачальны слоўнік беларускай мовы, 1972, стар. 376, цана 5 зл. 40 гр.

Другое выданне вельмі карыснага слоўніка. У ім растлумачана каля 6 тысяч слоў і ўстойлівых словазлучэнняў. Склалі слоўнік Баханькоў А. Я., Гайдукевіч І. М., Шуба П. П. Адрасуецца ён да вучняў сярэдніх школ, але гэта зусім не значыць, што ён не павінен знайсціся ў бібліятэках усіх пачатковых школаў, дзе навучаецца беларуская мова.

Падгайскі Л. П., Словазлучэнне ў беларускай мове, 1971, стар. 192, цана 3 зл. 80 гр.

Навуковае даследаванне беларускага вучонага. Аўтар даў яму падзагаловак „Дзеяслоўна-іменныя словазлучэнні з акалічнаснымі адносінамі". У кнізе аналізуюцца дзеяслоўна-іменныя словазлучэнні з прасторавымі адносінамі і сродкі іх выражэння. На шматлікіх прыкладах аўтар разглядае граматычныя сродкі выражэння часавых, прычынных і мэтавых адносін.

Беларускі фальклор у сучасных запісах, 1973, стар. 304, цана 13 зл. 80 гр.

Сістэматычны навуковы звод твораў вуснай народнай творчасці, запісаных у апошнія гады ў Брэсцкай вобласці. У асноўным гэта традыцыйныя жанры. Большасць твораў публікуецца ўпершыню. Шэраг запісаў мае нотныя прыклады. Складальнік выдання В. А. Захарава.

Лойка А. А., Беларуская паэзія пачатку XX стагоддзя, 1972, стар. 240, цана 9 зл. 40 гр.

Кніга вядомага беларускага літаратуразнаўцы і паэта. Разглядаюцца ў ёй ідэйна-эстэтычны рост і мастацкія пошукі Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, А. Пашкевіч-Цёткі і іншых беларускіх паэтаў пачатку XX стагоддзя. Асаблівую ўвагу вучоны звяртае на даследаванне своеасаблівасці творчасці, метаду, стылю і фальклорнай асновы твораў гэтых пісьменнікаў.

Андраюк С. А., Жыццё, літаратура, героі, 1973, стар. 176, цана 7 зл.

Зборнік літаратуразнаўчых артыкулаў аб лепшых творах беларускай прозы, якія паявіліся ў 1955—1965 гадах. Аўтар — вядомы крытык і літаратуразнаўца — разглядае прозу І. Шамякіна, І. Мележа, Я. Брыля, В. Быкава, А. Кулакоўскага, І. Пташнікава, У. Караткевіча.

Кнігарня імпартных выданняў у Беластоку ахвотна высылае кнігі за паштовым залічэннем (з далучэннем рахункаў). Запатрабаванні кіруйце па адрасу:

„Dom Książki", Białystok, ul. Kilińskiego 10.

(мг)

Пачатак на стар. 1

Вынікі залежаць ад нас

і ўся наша арганізацыя. Гэтай справе будуць прысвечаны спецыяльныя пасяджэнні Галоўнага праўлення і праўленняў аддзелаў БГКТ. Неабходна мабілізаваць наша асяроддзе да яшчэ больш актыўнага ўдзелу ў развіцці гаспадаркі, да павышэння прадукцыйнасці на сяле і на прамысловых прадпрыемствах. Грамадскія чыны на карысць асяроддзя і павышэнне эстэтыкі вёсак і мястэчак — гэта адавочны выраз замілавання да свайго краю. Будзем імкнуцца, каб у нашых конкурсах песні і аглядах самадзейных мастацкіх калектываў прымала ўдзел як мага большая колькасць людзей, а ў іх рэпертуары знаходзіліся творы, выражаючыя падзяку працоўным за іх добрую работу і ахвярнасць, прыносячыя эстэтычнае задавальненне. Аддзелы, побач з іншымі мерапрыемствамі, правядуць урачыстыя фэстыны, прысвечаныя 30-годдзю Народнай Польшчы. Сістэматычна будзем працаваць над умацаваннем нашых гурткоў, заахвочваць іх да большай ініцыятывы ў грамадскай і культурнай дзейнасці ў сваёй мясцовасці, асабліва ў працы клубаў, святліц і дамоў культуры. Важнай галіной з'яўляецца таксама запіс і выяўленне выканаўцаў вуснай народнай творчасці Беласточчыны. Адважней і шырэй будзем паказваць нашы мастацкія калектывы, і не толькі на Беласточчыне. Словам, год 1974 будзе годам усебаковага ажыццяўлення нашых праграмных заданняў. Эфекты іх будуць пладатворныя, калі ў іх рэалізацыю ўнясе свой уклад кожны член БГКТ. А яны ставяць сваёй мэтай усё тое, што вядзе да лепшага і больш культурнага жыцця кожнага сучаснага чалавека.

Гутарыў **Мікалай Гайдук**

Патрэбная прафесія

Едучы праз Трасцянку ў Нараў, у пачатку вёскі можна ўбачыць на адным панадворку шмат цэмбравін, ці водных бетонных кругоў, як іх часта называюць. Кожны ў Трасцянцы ведае, што вырабам іх займаецца Міхась Астроўка. Шмат ужо пабудавана тут калодзежаў дзякуючы яму. Раней было вялікае запатрабаванне на кругі з укосным заканчэннем, якія выкарыстоўваліся для пропускаў вады на дарогах. Тады Міхась Астроўка значна аблегчыў дарожным уладам будову і рамонт камунікацыйных шляхоў, бо не трэба было прывозіць цэмбравіны з іншых ваяводстваў. Міхась Астроўка з гонарам падкрэслівае, што гэта і ён будаваў шашу з Беластока ў Аўгустоў.

Цяпер у Міхася Астроўкі ўжо і сілы не тыя, што раней, і са здароўем не найлепш. Таму памагаюць яму і жонка, і сын, калі вернецца дамоў з Беластока.

У сваёй вёсцы Міхась Астроўка вядомы таксама некаторымі цікавымі ініцыятывамі. Вось, напрыклад, хаця б справа начной варты. У Трасцянцы больш 200 сем'яў, а вартаваць згадзілася не больш 20 гаспадароў. Адзін стары, другі малы, трэці хворы, чацвёрты быў звольнены, бо быў членам добраахвотнай пажарнай каманды. І так выходзіла, што некаторыя павінны былі вартаваць па два разы ў месяц.

На адным з вясковых сходаў у 1971 годзе Міхась Астроўка запрапанаваў наймаць вартаўніка і плаціць яму па 1500 злотых у месяц. Пасля доўгіх разважанняў прапанова гэта была прынята. Цяпер задаволена і вёска, якая аплочвае вартаўніка, і вартаўнік, які атрымоўвае немалую зарплату.

Другая прапанова Міхася Астроўкі датычылася электрычных слупоў, якія былі адсунуты ад кравэнжніка не на адзін метр, а на два метры. Ліпы таксама былі пасаджаны далей, чым гэта раней планавалася.

Па яго прапанове вызначана вясковая дарога на раку па простай лініі, а не так, як мела яна ісці — вінклем.

А Міхась Астроўка ж — гэта адзін з тых людзей, аб якіх, здавалася б, няма чаго пісаць, проста адзін са звычайных людзей вялікай вёскі Трасцянка, што ў Гайнаўскім павеце.

Тэкст і фота **М. Хмялеўскага**



Міхась Астроўка працуе.



Беларуская літаратура

Аляксандр Баршчэўскі

Нашаніўская пара

КАРУСЬ КАГАНЕЦ — ЧАСТКА II

Творчасць Каганца не прадстаўляе сабой выключна багатай з'явы. Аднак паспрабаваў ён сваіх сіл у розных жанрах і ў некаторых дайшоў да сур'ёзных вынікаў. Творчасць Каганца можам падзяліць на:

- паэзію
- апавяданні
- драматургію
- публіцыстыку і карэспандэнцыю
- жывапіс

Паэзія. Гэтым відам творчасці займаўся Каганец, мабыць, на працягу ўсяго свайго свядомага жыцця. Нягледзячы на гэта, ніколі не ўдалося яму выдаць паэтычнага зборніка. Вершы яго параскіданы па „Нашай ніве", „Беларускіх календарах", „Вольнай Беларусі" і „Беларусі". Многія вершы паэта да сёння не апублікаваны. Некаторыя загінулі ў час вайны. Першыя вершы напісаў Каганец у 1893 або 1894 годзе.

Будучы ў Мінску, я меў магчымасць пазнаёміцца з неапублікаванымі вершамі Каганца. У суме гэтых вершаў ёсць чатырнаццаць. Некаторыя з іх вельмі кароткія, а некаторыя налічваюць больш чым сто радкоў. Па сутнасці, усе вершы Каганца датаваныя. Пад першым вершам, які пачынаецца ад слоў „Ой, у полі вецер вее", напісана: „Кветня 1894 лета"; пад другім вершам напісана: „18 траўня 1894 л." Апошні верш з гэтага цыкла падпісаны 15 траўня 1896 г. Усіх вершаў у першым сшытку шэсць. Былі яны, бадай, напісаны рукой самога Каганца, які ўжываў у некаторых выпадках дзіўныя літары. Некаторыя з іх былі ўзяты з царкоўнаславянскай мовы, а некаторыя, бадай, прыдумаў сам аўтар. У гэтым жа сшытку знаходзяцца яшчэ чатыры вершы пад агульным загалоўкам „Народныя". Цяжка выказвацца ў гэтай справе катэгарычна, аднак вершы гэтыя, праўдападобна, не былі народнымі творамі, але былі створаны Каганцом, які выкарыстаў пры іх напісанні фальклорную традыцыю. Паасобныя вершы не датаваны. Толькі пад апошнім чацвёртым і вельмі доўгім вершам дапісана: „Каганец 19/22.VI.07 Ліссі-Норы".

Апрача гэтых вершаў, у Каганцовых паперах знаходзяцца лісткі з далейшымі яго чатырма вершамі. Над гэтымі вершамі ёсць паметка: „Запісала для зборніка яго твораў 30.V.22 Лёсік". Вершы гэтыя спецыфічны тым, што былі напісаны Каганцом у Мінскай турме. Першы верш пад загалоўкам „Купалле (лето)" падпісаны: „Мінская турма 1910 г. К. Каганец". Другі верш „Юрыя (весна)" — „Мінская турма 1910, К. Каганец". Трэці верш „Вялікі чацвер" — „Мінск (турма) 19.IV. 1911 г. К. К.". Чацвёрты верш без загалоўка. Пачынаецца ад слоў: „Устань, народ, прачухайся". Пад вершам паметка: „III.1911, Турма Мінск К.К.".

Да рэдка вядомых належаць таксама вершы, апублікаваныя ў 1928 годзе Касцяровічам („Савецкая Беларусь", 1928, нр. 17). Касцяровіч апублікаваў тры нядоўгія вершы Каганца. Усе яны звязаны супольнай тэматычнай ніццю. Прысвяціў іх аўтар птушкам: салаўю, жаваранку і ластаўцы.

Два вершы Каганца апублікаваў у 1927 годзе ў Вільні Дварчанін у кнізе „Хрэстаматыя новай беларускай літаратуры".

Аб вершах Каганца, апублікаваных у дарэвалюцыйных часопісах, мы ўжо гаварылі.

Даволі цяжка сказаць, колькі вершаў напісаў Каганец. Праўдападобна, не зробім вялікай памылкі, калі скажам, што не многа. Ніколі не быў ён прафесіянальным паэтам і, мабыць, паэзію лічыў заўсёды заняткам другарадным. Пры гэтым аднак паэзія для Каганца не была нявіннай гульнёй у словы. Звязаў з ёю вялікія грамадскія і асабістыя надзеі. Няма аднак сумненняў, што вершы К. Каганца і па вартасці зместу і па вартасці формы ўступаюць значна вершам галоўных паэтаў-нашаніўцаў. Паэзія Купалы, Коласа, Багдановіча ўжо ў перыяд „Нашай нівы" была з'явай агульнанароднай, паэзія Каганца была, па сутнасці, толькі яго ўласнасцю.

СУСТРЭЧЫ З КАНДЫДАТАМІ Ў РАДЫ НАРАДОВЫЯ

МІХАСЬ СКЕПКА

У Гайнаўскім павеце есць нямала гаспадароў, у якіх многаму можна павучыцца. Да такіх менавіта сялян належаць Міхась Скепка з Ягаднік, які з'яўляецца цяпер кандыдатам у радныя гміннай рады нарадовай у Дубічах Царкоўных. Зямельных угоддзяў у яго 11 га, у тым ліку 6 га ворнай зямлі і 5 га пашы і сенажацяў. Ураджаі ў яго добрыя, больш 30 цэнтнераў збожжа з гектара, 270 цэнтнераў бульбы, а ўраджай кармавых буракоў проста рэкордны. З 0,20 га Міхась Скепка сабраў 20 балонаў буракоў, а кожны балон буракоў важыць каля 1,5 тоны. Зразумела, кармавыя буракі гавораць аб тым, што Міхась Скепка займаецца жывёлагадоўляй.

Так, яна ў яго гаспадарцы займае галоўнае месца. У яго цяпер 5 дойных кароў. Малака хапае і сабе, і на продаж дзяржаве. У мінулым годзе былі ў яго тры дойныя каровы, ад якіх на працягу 6 месяцаў прадаваў ён дзяржаве больш 25 літраў малака ў дзень. Прадаў таксама ў мінулым годзе яловае быдла агульнай вагою больш 2,5 тон. Цяпер таксама ў адным з хлявоў у Скепкі 6 яловак, у тым ліку 2 нізіннай чорна-белай пароды.

Вялікія дасягненні мае Міхась Скепка ў свінагадоўлі, якой з размахам займаецца ад 1962 года. За тры апошнія гады пабудаваў ён вялікі свінарнік, у якім ёсць 6 загарад, напоўненых пародзістымі свіннямі. Ёсць там 26 парасят, 10 свінак-мацёрак, 6 мацёраў, 2 кнуры і 2 кормнікі, якія спажыткуе ён для сваёй сям'і. У гэтым годзе Скепкі прадалі на гадоўлю 20 маладых свінаматак і шмат пяцімесячных падсвінкаў. На працягу года такіх падсвінкаў да адкорму прадаюць яны ад 60 да 100 штук.

У адным з будынкаў на панадворку Скепкі знаходзіцца курыная ферма. Налічваецца ў ёй 140 штук нёсак. Штодзённа зносяць яны да 90 штук яечак. Міхась Скепка плануе разбудаваць курыную ферму і павялічыць колькасць нёсак да 300 штук.

У Скепкаў усяго многа, але і работы многа, прыходзіцца рана ўставаць і позна класціся спаць. Напэўна, непадсілу было б Міхасю Скепку з гэтым усім справіцца, каб яму не дапамагалі ў працы жонка, бацькі, а вельмі часта і дзеці. У сям'і падзелена праца. Міхась Скепка раніцай ідзе карміць кароў, а жонка даглядае курэй. Бацька яго вельмі часта з 3 гадзіне раніцы паднімаецца на ногі, насыпае ў парнік бульбу і варыць яе для свіней, а пасля з рознымі мяшанкамі і асыпкамі рыхтуе ім ежу. Маці Міхася варыць снеданне, рыхтуе абед, адным словам займаецца кулінарнымі справамі. Дзеці заганяюць жывёлу ў хлявы, звальваюць на ток сена для кароў, памагаюць пры розных меншых работах. Калектыўная і згодная праца дае і добрыя вынікі.



Міхась Скепка пабываў на экскурсіях у Познаньскім ваяводстве, у Сямяціцкім і Беластоцкім паветах. Усюды ён імкнуўся навучыцца новаму і прымяніць гэта ў сваёй гаспадарцы. Цяпер ад яго многія гаспадары бяруць прыклад, як трэба добра, па-сучаснаму гаспадарыць.

Тэкст і фота **М. Хмялеўскага**

МАЛА, АЛЕ ЦІКАВА

Найменшы алфавіт

Алфавіт гавайскай мовы складаецца з 12 літараў.

Найменшы мозг

Мозг матыля велічынёй галоўкі шпількі мае ў сабе каля 8.000 нервовых валокнаў.

Пакуль снег не прыкрые

Мала якія сельгасгурткі на Гайнаўшчыне нерахоўваюць свае сельскагаспадарчыя машыны ў гаражах, шопах або пад вятамі. Найчасцей стаяць яны ўлетку і зімою пад голым небам. Такім чынам яны хутка іржавеюць ды выходзяць са строю. Належна задбалі аб сваіх машынах МБМ у Курашаве, сельгасгурткі ў Махнатым, Навасадах, Нарве. У ляўкоўскім сельскагаспадарчым гуртку машыны стаяць, нічым не прыкрытыя, проста на полі, а ў Палічнай без ніякай агароджы на пляцы.

У многіх сельгасгуртках механізатары толькі ў лістападзе ўзяліся за кансервацыю сельгасмашын. Найчасцей машыны забяспечваюцца перад уздзеяннем даждж або снегу, толькі паліваючы іх ропай. А добра, калі машыны забяспечваюць смарамі або антыкаразійнымі фарбамі. У Палічнай, напрыклад, усе машыны памаляваны фарбай.

— Сустрэлі мы ў „кулках" таксама многа паламаных і наіржавелых машын. Адзіным іх забяспячэннем былі тоўстыя пласты балота. Побач з імі на пляцы ляжалі развінчаныя часткі... У такіх сельгасгуртках, мабыць, дыспетчары чакаюць толькі, каб як мага хутчэй выпаў снег і прыкрыў усе непаладкі ў машынных парках.

Тэкст і фота **Я. Ц.**



У Палічнай машыны стаяць пад голым небам, але пастаўлены ў „лінейку" і памаляваны свежай антыкаразійнай фарбай.

ФАЛЬКЛОР

ЛЮБОЎНАЯ

Moderato



Вы-со-кі ду-бо-чок, шы-ро-кі ліс-то-чок, Нэ



БА-ЧЫ-ЛА МІ-ЛЕНЬ-КО-ГО ВЖЭ ТРЭ-ТІ ДЭ-НЕ-ЧОК, Нэ ЧОК

Высокі дубочок, шырокі лісточок,
Нэ бачыла міленького вжэ й трэті днечок.
Нэ бачыла міленького вжэ й трэті днечок.
По садоньку ходжу, руту-мяту саджу,
— Прыйдi, прыйдi, моя міла, штось я тобе скажу.
Прыйдi, прыйдi, моя міла, штось я тобе скажу.
Што я тобе скажу, што людэ говорат,
Што до тэбэ молодоі кавалеры ходят.
Што до тэбэ молодоі кавалеры ходят.
Чатыры ходіло, нэвіерно любіло,
А я стаў пяты ходіті, стаў віерно любіті.
— Прошу нэ ходіті, прошу нэ любіті,
Як узнае батько-маті, будэ мэнэ біті.
Як узнае батько-маті, будэ мэнэ біті.
— Я й буду ходіті, я й буду любіті,
Як узнают батько-маті, нэ будут нас біті
Як узнают батько-маті, нэ будут нас біті.

Ад Анны Стахвіюк, 1924 года нараджэння, вёска Трасцянка Гайнаўскага павету, запісаў 2 жніўня 1973 года Мікалай Гайдук. Нотны запіс з магнетафоннай стужкі зрабіла Людміла Панько.

БППС пашырае сваю дзейнасць

Беластоцкае прадпрыемства паўторнай сыравіны вядзе скупку макулатуры (найбольш пры дапамозе школьнікаў), шмат, старых шын ад самаходаў, пабітага шкла рознага колеру, касцей, вырабаў пластмасавага паходжання, мяшкоў ад мінеральных угнаенняў і старых мяхоў з юты. Макулатура ідзе на прадпрыемствы, якія прадукуюць паперу, між іншым, у Ёзёрне каля Варшавы, Еленюю Гуру, Астралэнку і Свець, пабітае шкло з шыбаў або шкляная пасуды — у гуту, між іншым, у Вышкаў, гумовыя шыны — у Болехаў і Валомін, на прадпрыемства „Стоміль". Косці ідуць на прадпрыемствы „Поллены" ў Новым Двары каля Варшавы, якое выпускае на рынак касметычныя вырабы. Другаразовая сыравіна такім шляхам трапляе ў пераапрацоўку ў маштабе тысяч тон у год.

Макулатура дазваляе на ашчаднасць старадрэву ў нашых лясах, неабходнай сыравіны ў працэсе прадукцыі паперы. Найбольш макулатуры назбірала школа ў Мечах Граеўскага павету. Затым ідзе школа № 5 у Гайнаўцы, школа № 2 у Сэйнах. Добра праводзіцца збор макулатуры ў Адрынках і Кляшчэлях Гайнаўскага павету, у прафесіянальнай школе ў Сямяцічах, у школе ў Плёсках Бельскага павету і ў Хілімонах Дуброўскага павету.

Беластоцкае прадпрыемства паўторнай сыравіны (БППС) мае 14 аддзелаў у паасобных паветах. Найлепш працуюць аддзелы ў Бельску, Ломжы, Элку і Сувалках.

У БППС працуе 260 асоб, найбольш — жанчыны. Прадпрыемства запэўніла ім працу ў сартоўнях макулатуры, пры прадукцыі ўпакоўкі для перавозкі шкляных слоікаў і розных прадуктовых тавараў.

БППС высылае даволі многа макулатуры на экспарт — у Аўстрыю, Італію, Фінляндыю, у Федэратыўную Рэспубліку Германіі, а нават Амерыку.

Прадпрыемства атрымае яшчэ ў канцы гэтага года новы будынак на вуліцы 27 ліпеня, у якім будзе памяшчацца цэх, гардэроб, кухня, умывальня і санітарыяты. У наступным годзе будзе перададзена ў карыстанне сартоўня ў Ломжы. У 1975 годзе распачнецца будова новай сартоўні, лепш механізаванай, у Беластоку.

БППС выконвае план у сярэднім у 113 працэнтах. Дырэкцыя многа ўвагі прысвячае паляпшэнню ўмоў працы сваіх рабочых і сацыяльна-бытавому забеспячэнню. У час летніх водпускаў рабочыя БППС могуць адпачываць у кампінговых доміках, якія прадпрыемства пабудавала ў Пшэвензі на Аўгустоўскіх азёрах.

Сярод 260-асабовага рабочага калектыву прадпрыемства значная частка — шматгадовыя рабочыя, нават з дваццацігадовым стажам. Гэта Аліцыя Астроўская, Леакадзія Кандрацкая, Анна Карольчук, Алеўтына Сушчынская, Аліцыя Голечак.

БППС шырока і ўсебакова прапагандуе збор макулатуры сярод школьнай моладзі. Для моладзі, якая мае ў гэтай акцыі найлепшыя вынікі, арганізуе экскурсіі, узнагароджвае іх веласіпедамі, дыпломамі, сувенірамі. Настаўнікі атрымліваюць каштоўныя рэчавыя ўзнагароды. У 1974 годзе галоўнай узнагародай для настаўніка, які найлепш арганізуе ў сваёй школе збор макулатуры, будзе мотавеласіпед.

Янка Цялушэцкі

З ЖЫЦЦЯ ВАРШАЎСКАГА АДДЗЕЛА БГКТ

Цікавая сустрэча

30 настаўнікаў з Беласточчыны, студэнтаў першага і другога курсаў завочнага аддзялення беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта сустрэліся ў Варшаве на чарговай выязной навучальнай сесіі.

3 лістапада г.г. па запрашэнню прэзідыума праўлення варшаўскага аддзела БГКТ студэнты-завочнікі наведалі памяшканне Беларускага таварыства на вул. Сенаторскай 8.

Падчас сустрэчы сакратар прэзідыума праўлення аддзела Віктар Швед расказаў гасцям аб дзейнасці варшаўскага аддзела.

Выконваючы просьбу прысутных, Алесь Баркскі і Віктар Швед чыталі свае новыя вершы.

Да позніх гадзін вечара за агульным сталом спяваліся прыгожыя беларускія песні. Настаўнікі-студэнты адчувалі тут сябе, як дома, на Беласточчыне.

Развіталіся са словамі: „Да новых сустрэч!".

Урачысты вечар

11 лістапада г.г. у памяшканні варшаўскага аддзела БГКТ адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 56-ай гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі.

З дакладам выступіў Віктар Швед, які таксама прачытаў свае вершы, прысвечаныя Вялікаму Кастрычніку.

У другой частцы вечара адбылася танцавальная вечарына. В. Ш.

БУДАЎНІЧЫЯ ПАРАДЫ

ДОМ ДЛЯ ВАСЬМІАСАБОВАЙ СЯМ'І



Вось план жылога дома, які — паводле нашых меркаванняў — найлепш можа задаволіць сялян паўднёва-ўсходніх паветаў Беластоцкага ваяводства. Прасторная кухня (амаль 17 квадратных метраў) і тры добра распланаваныя пакоі, з якіх два маюць асобныя, незалежныя ўваходы праз сені. Могуць быць прызначаны яны для дарослых дзяцей, або для кватарантаў. Таму перш за ўсё рэкамендуем будаваць такі дом у наваколлі Белавежы, Нараўкі, Семяноўкі і Бандароў, ды ўсюды там, куды ў бліжэйшыя гады будзе наплываць асноўная хваля турыстаў. З думкай аб турыстах можна адпаведна загаспадарыць яшчэ паддашша. План прадбачвае там адзін пакойчык. Аднак на гэтым паддашшы можна абсталяваць таксама другі даволі прасторны пакой і яшчэ застанецца шмат месца на падручную кладоўку-сховішча.

Пад адной палавінай будынка праектанты прапануюць зрабіць пограб, а другую засыпаць пяском. Здаецца нам, што лепш было б і другую частку пограба адпаведна загаспадарыць. Можна там абсталяваць кацёл цэнтральнага абагравання (уваход непасрэдна з кухні праз люк у падлозе, забяспечаны накрыўкай), склад вугалю або коксу, ды ўрэшце гэта памяшканне магло б служыць як цямніца для вырошчвання пячарак. Другая частка пограба была б тады халоднай, і былі б там спрыяльныя ўмовы для перахавання бульбы, яблык, агароднiны і мяса, а таксама фруктовага віна, сокаў і іншых салодкіх зімовых запасаў.


Пабудаваць такі дом можна з чырвонай і белай цэглы, або з бетонных ці вапнавых блокаў, а таксама з пустакоў тыпу „альфа". Строй — з бэлек тыпу „Т-27" або „Клейна", дах — высокі, кроквы і латы — драўляныя. Фундамент — з цэменту і гравію або з каменя. Дах — крыты этэрнітам або чарапіцай.


Пад будову трэба прыблізна 104 квадратныя метры плошчы.


Прадбачваецца абсталяванне для водаправода, каналізацыі, электрасілы і цёплай вады. Ёсць магчымасць пабудовы абсталявання цэнтральнага абагравання, але гэта трэба ўзгодніць у час пакупкі праекта.

Жадаем поспехаў у будове!


М. Н.







RZUT PRZYZIEMIA



PROGRAM UŻYTKOWY

1.	PIWNICA	42,10 m²
2.	SIEŃ	9,27 m²
3.	POKÓJ	15,80 m²
4.	POKÓJ	14,87 m²
5.	KUCHNIA	15,80 m²
6.	PRZEDSIONEK	2,70 m²
7.	SPIŻARNIA	2,70 m²
8.	UMYWALNIA	4,40 m²
9.	POKÓJ	17,80 m²
10.	POKÓJ NA PODDASZU	[illegible]

Куток практычных ведаў



НАШ БІЯЛАГІЧНЫ ГАДЗІННІК

Чаму адны адчуваюць стомленнасць і неахвоту да працы адразу пасля снедання?.. Чаму іншым найлепш працуецца якраз рана, а пад вечар хочацца толькі аднаго... спаць?

Дактары кажуць, што прычына гэтага ў нерэгулярным спосабе жыцця. Вядома, што ніводзін орган не працуе таксама рэгулярна на працягу 24 гадзін, а кожны працуе ў іншым рытме. Напрыклад, людское сэрца і крываносныя сасуды найслабей працуюць а 4 раніцы. Праца іх ад гэтай гадзіны паступова ўзрастае і пачынае ападаць толькі пасля 21 гадзіны. Найбольшая цеплыня цела наглядаецца паміж гадзінамі 9—12. Утрымоўваецца яна на гэтым самым больш-менш узроўні да гадзіны 18, а пасля пачынае паступова ападаць. Страўнік жа найбольш інтэнсіўна працуе на працягу першай паловы дня, а ныркі — пад вечар.

Змены такога біялагічнага рытму, зразумела, уплываюць на нашу здольнасць да працы на працягу сутак. Наймацнейшымі мы наогул з'яўляемся паміж гадзінамі 8-12 і пасля поўдня ў гадзінах 14-17. Найслабейшыя ж — паміж 3-4 раніцы і ў гадзінах 12-14. Прымаючы пад увагу рытм працы страўнікавай сістэмы, вынікае, што ў першай палове дня ежа чалавека павінна быць багата бялком і тлушчам, а ў другой — у ёй павінна знаходзіцца больш цукру. Снеданне павінна быць па колькасці ежы найбольш сытнае, а вячэра вельмі скромная.

Чаму ж людзі, якія якраз раніцай, калі рытм крываноснай і страўнікавай сістэмы ўзмацняецца, бываюць стомленыя? Таму што кожны механізм, якім з'яўляецца сістэма чалавека, працуе інакш. Напрыклад, чалавек, у якога нізкі ціск крыві, дасягае адпаведнага ўзросту даплыву крыві, якая вызваляе энергію не а гадзіне, скажам, 9 раніцы, а каля поўдня, чалавек жа, у якога высокі ціск крыві, адчуе стомленасць падвечар.

Акрамя таго, наша псіхіка, гэта значыць і наш біялагічны гадзіннік, дастасоўваюцца да пэўных умоў. Паўсюдна гавораць аб прывычках, аб так званых умоўных рэфлексах. Калі хтосьці заўсёды працуе ўначы, дзень для яго будзе найлепшы для сну і адпачынку. Але гляньце толькі на таго, хто з дзённай працы пяройдзе на начную! Пакуль яго рытм шматлікіх біялагічных працэсаў зменіцца, ён доўга будзе стомлены, будзе дрэнна спраўляцца на рабоце.

А што будзе, калі гэты рытм мы будзем змяняць пастаянна? Напрыклад, раз будзем доўга працаваць вечарам, іншым разам устанем рана і рана ляжам спаць, раз будзем снедаць а 5 раніцы, а на наступны дзень толькі а 9 гадзіне знойдзем час на снеданне. Тады арганізм, які паддаем мы пастаянным зменам, не можа працаваць спраўна.

Таму, калі мы хочам быць здаровымі, неабходна прымаць пад увагу правы нашага біялагічнага рытму. З „гадзіннікам у руках" трэба сачыць за гадзінамі снедання, абеду, вячэры, за гадзінамі працы і адпачынку.

Эскулап



Да 1955 года англійская разведка мела нядрэнную агентуру ў міністэрстве замежных спраў ФРГ. Але яна ўвесь час шукала магчымасці папаўнення сваёй агентурнай сеткі. Так, у 1956 годзе заходнеберлінская рэзідэнтура СІС правodзіла аперацыю па ўладкаванню свайго агента ў МЗС ФРГ. Наогул у многіх звеннях дзяржаўнага апарату ФРГ былі агенты СІС. Англійскія разведчыкі і іх агенты таксама вялі актыўную работу па апрацоўцы японскіх дыпламатаў за граніцай. Справа ў тым, што СІС з прычыны моўнага бар'ера, сацыяльных ўмоўнасцей і некаторых іншых прычын адчувала цяжкасці ва ўстанаўленні кантактаў з японскімі службовымі асобамі ў самой Японіі. Таму было вырашана арганізаваць работу з дыпламатычнымі прадстаўнікамі Японіі ў трэціх краінах. Пры гэтым, у прыватнасці, рэкамендавалася выкарыстоўваць павышанае пачуццё адзіноты, што перажывалі японцы за граніцай.

— Вы многія гады працавалі ў англійскай разведцы і, відаць, можаце праліць святло на тое, як выкарыстоўвае СІС розныя катэгорыі англійскіх грамадзян у падрыўной дзейнасці супраць Савецкага Саюза і іншых краін сацыялістычнай садружнасці.

— У прэсе ўжо друкаваліся матэрыялы аб тым, як СІС у сваіх мэтах выкарыстоўвае радыёкарпарацыю Бі-Бі-Сі, многіх журналістаў англійскіх газет і часопісаў, якія спецыялізуюцца на арганізацыі антысавецкіх кампаній і правакацыйных выдумак супраць сацыялістычных краін. Гэта зусім правільна, хоць журналісты толькі адна з катэгорый асоб, якіх выкарыстоўвае разведка. СІС ахвотна схіляе „да сваёй веры" прадстаўнікоў розных экспартна-імпартных фірм. Добра вядома ў гэтым плане справа англійскага „бізнесмена" Грэвіла Віна. Разведка спрабуе таксама вербаваць агентуру сярод турыстаў, якія накіроўваюцца ў сацыялістычныя краіны. І што характэрна, СІС прыцягвае для сваёй работы людзей без якіх-небудзь узгадненняў з іншымі дзяржаўнымі ведамствамі. Аднак выкарыстанне англійскай разведкай такіх асоб, як, напрыклад, дыпламатаў усіх рангаў, англійскіх супрацоўнікаў ААН, патрабуе ў адпаведнасці з дырэктывамі СІС узгаднення з МЗС Вялікабрытаніі, хоць, як правіла, яно носіць чыста фармальны характар. Наогул, парадак вярбоўкі або выкарыстання пералічаных мною афіцыяльных асоб, а таксама грамадзян Канады, Індыі, Пакістана і іншых краін, якія ўваходзяць у Брытанскую садружнасць нацый, пунктуальна вызначан у інструкцыях Інтэліджэнс сэрвіс, у прыватнасці, у пастаянна дзеючай інструкцыі, якая носіць назву „Одэрбук".

Дзейнасць Блейка дала магчымасць, як правільна ацэньваў галоўны суддзя Англіі Паркер, звесці на нішто многія аперацыі „псіхалагічнай вайны" і шпіянажу супраць СССР і сацыялістычных краін. Гэта і былі тыя „намаганні англійскага ўрада", пра якія вёў гаворку лорд Паркер.

— Што вы перажылі, Джордж, як вы сябе адчувалі ў турме?

Блейк задумваецца і, не спяшаючыся, гаворыць:

— Работа разведчыка заўсёды рызыка. Я ведаў, на што іду і ў імя чаго. Я да канца быў упэўнены ў правільнасці выбару. Гэта надавала мне сілы і ў камеры лонданскай турмы. Перш за ўсё я паставіў перад сабой задачу захаваць разумовае і фізічнае здароўе, каб урэшце ўцячы і працягваць барацьбу. Я дабіўся дазволу турэмных улад удасканальваць арабскую мову, займаўся фізічнымі практыкаваннямі па сістэме ёгаў...

Будучы за кратамі, — працягвае ён, — я заўсёды цвёрда ведаў, што сябры не забудуць мяне. У першую чаргу, безумоўна, мая маці. Яна, як і раней, засталася для мяне самым блізкім і дарагім сябрам. Калі мяне арыштавалі і аб'явілі прыгавор — сорак два гады, яна аддала ў хімчыстку мае касцюмы, потым прафталініла іх і склала ў гардэроб. „Няхай рэчы чакаюць свайго гаспадара, — часта гаварыла яна сябрам. — Джордж вернецца на волю!" Моцная духам жанчына.

Я ўпершыню за ўсё сваё жыццё даю інтэрв'ю журналістам, — прызнаецца Блейк. — Ды гэта і зразумела. Аб цяжкай, самаадданай і разам з тым цікавай рабоце разведчыка людзі даведваюцца праз шмат гадоў, ды і то не заўсёды...

Мы думаем, што гэта, відаць, яго далёка не апошняе інтэрв'ю.

У заключэнне застаецца дадаць, што самаадданая дзейнасць таварыша Дж. Блейка была адзначана высокімі ўрадавымі ўзнагародамі — ордэнамі Леніна і баявога Чырвонага Сцяга.

ТРЫБУНА чытачоў

Тэлевізар у Спічках

У Спічках цяпер 12 тэлевізараў. Выходзіць, што кожны сёмы жыхар нашай вёскі мае тэлевізар. Аднак гэтага ўсё ж замала. Вёска ж налічвае 80 гаспадарак. Быць можа, праз некалькі год лік тэлевізараў у Спічках павялічыцца. А пакуль што многія жыхары Спічкоў марылі, каб купіць супольны тэлевізар на цэлую вёску і паставіць у тым будынку, дзе калісьці была пачатковая школа. Мары споўніліся ў гэтым годзе. У суботу 13 кастрычніка 1973 года Спічкі атрымалі тэлевізар. Палову заплаціла за яго добраахвотная пажарная ахова ў Спічках, а другую палову дала пажарная ахова з Бельска Падляшскага.

Тэлевізар паставілі ў будынку школы. Тут ёсць парты, на якіх можна сядзець. З першага дня ў школьным будынку сабралася многа людзей, усе з зацікаўленнем глядзелі праграму. Солтыс нашай вёскі сказаў, каб у час перадач панавала цішыня. На сценах паявіліся таблічкі: „Курэнне сурова забаронена“ і „Просім захаваць чысціню“. Жыхары захоўвалі парадак. Хто хацеў закурыць, выходзіў на двор і там курыў. Дзецям можна глядзець перадачы толькі да сёмай гадзіны трыццаці мінут вечара. Так што ў школе пануе дысцыпліна, якой усе павінны трымацца. Солтыс таксама забараніў тут іграць у карты.

Васіль Асеннік,
Спічкі



СТАРТ

Многа год я пражыў
Ў роднай вёсцы Спічках,
Я тут ў школу хадзіў
У малодшых гадах.

Часта плакаў тады,
Калі двойку дастаў,
— Ты не плач, мой малы, —
Мяне пан суцяшаў.

А ўжо потым пайшоў
Я вучыцца далей,
Сабе школу знайшоў —
Беларускі ліцэй.

Ды вось тут я пачаў
Многа вершаў чытаць.
Многа працы ўкладаў —
І свае стаў складаць.

Васіль Асеннік
Спічкі (Бельскі беларускі ліцэй)

✲

Чытаю верш —
служу малебень
паэта слову.
Слову — адлюстраванню
залётнага моргання звёзд,
адлюстраванню,
літаній прастора.
Чытаючы сучасную
паэзію,
як з цацкай.

Яўгень Семянюк
Бельскі беларускі ліцэй

ВОСЕНЬ

Ужо восень наступіла
Жоўта стала на двары,
Ужо і птушкі не спяваюць,
Ды прыгожа у бары.

Ўжо і бусел не ступае
Па балоце за сялом,
І ўсе дзеці добра знаюць,
Паляцеў ён з жураўлём.

Поле ўжо не залаціцца
Так, як летам, калі жнуць.
Бульбы людзі не капаюць,
Сеюць жыта і аруць.

Галіна Конах
Гайнаўскі беларускі ліцэй

Міхалоўская каса СОП

Уся дапамога дзяржавы ў галіне грашовых пазык адбываецца пры пасрэдніцтве СОП-у, які на пазыкавых умовах можа даць грошы на куплю добрага пасяўнога матэрыялу, штучных угнаенняў, нават на невялікія будовы, звязаныя з так званай сельскагаспадарчай прадукцыяй, інакш кажучы, будовы, патрэбныя для гаспадара.

СОП у Міхалове мае свой уласны будынак касы і гаспадарчы будынак. Развівае карысную дзейнасць у гмінах Міхалова і Шымкі. Міхалоўскі СОП у 1972 годзе на пазыкавых умовах даў грошы 2393 гаспадарам.

Як інфармуе кіраўнік СОП-у ў Міхалове (Беластоцкі павет) Мікалай Ваўрэнюк, які працуе тут ужо 19 год, за 1972 год сума выплачаных СОП-ам крэдытаў дасягнула 5 мільёнаў 155 тысяч злотых, гэта больш на 1 мільён 511 тысяч, чым было выплачана ў 1971 годзе.

„Шмат гаспадароў, — працягвае далей кіраўнік, — бярэ крэдыты на куплю штучных угнаенняў. Гэта пацешлівая з'ява. СОП на гэтую мэту ў 1972 годзе выдаў 896 тысяч злотых“.

Вялікую папулярнасць сярод гаспадароў маюць уклады, прэміраваныя трактарамі. 13 жніўня 1973 года адбылося ў нашым ваяводстве лясаванне трактараў. Пашанцавала Мікалаю Шмызе з гміны Шымкі, дзе ёсць аддзел міхалоўскага СОП-у. Выйграў ён новы трактар „Урсус Ц-330“. У нашым ваяводстве гаспадары атрымалі 8 такіх трактараў.

Апрача пазыкавай дзейнасці СОП праводзіць акцыю ашчаднасці. Вялікая частка гаспадароў у гміне Міхалова разумее патрэбу ашчаднасці, як гаворыцца, кожнай залатоўкі. За мінулы 1972 год 15 мільёнаў 640 тысяч злотых уплацілі гаспадары на свае СОП-аўскія ашчадныя кніжачкі. План ашчаднасці ў 1972 годзе быў выкананы ў 107,2%.

Павел Гутнік,
Агульнаадукацыйны ліцэй у Міхалове



Дарагое „Сэрцайка“!

Мне 17 год. Жыву я ў вёсцы, але вучуся ў сярэдняй школе, у горадзе. У школу штодзень езджу аўтобусам. Гэтым жа аўтобусам ездзіць і Віця, з якім я пазнаёмілася ў пачатку школьнага года. Ён вучыцца ў апошнім класе тэхнікума. Спачатку я адносілася да яго, як да добрага сябра, вельмі сімпатычнага хлопца, які культурна адносіцца да мяне і ўвогуле да дзяўчат. Потым ён сказаў, што мяне кахае, і наша сяброўства перайшло ў вялікае каханне. Мы часта сустракаліся. У нядзелю Віця прыязджаў да мяне на вёску. Я пераканалася, што каханне Віці сапраўднае, звязана толькі з пачуццямі. Але нядаўна Віця ўжо перастаў даязджаць да школы. Жыве ў горадзе, а я даязджаю далей, і мы не можам так часта спатыкацца. Да таго Віця не прыехаў да мяне ў нядзелю. Мне вельмі сумна. Пасля нядзелі мы спаткаліся, Віця вёў сябе так, як заўсёды. Сказаў, чаму не прыехаў у нядзелю: было вельмі многа матэрыялу на панядзелак, бо гэта ўжо апошні год вучобы. Не ведаю, ці гэта праўда. Я ўсё думаю аб гэтым, баюся, каб Віця мяне не пакінуў. Гэта і ў вучобе перашкаджае, але не магу адагнаць ад сябе гэтых думак. Можа, ён не хоча ўжо са мной хадзіць, але нашто час ад часу спатыкаецца, ды і лісты піша да мяне дадому? Можа ты, „Сэрцайка“, падкажаш, што рабіць?

Міра з Гайнаўшчыны

Міра! Непатрэбна хвалюешся. Няма тут ніякіх падстаў, каб Віці не верыць. Па-мойму, між вамі ўсё ў парадку. Ён жа ў апошнім класе, працы сапраўды мае шмат і кожная гадзіна яму дарагая. У цябе таксама часу не замнога, калі ты вучышся, дык не трацЬ яго на недарэчныя роздумы. Галоўная справа для вас — вучоба. Ёй прысвяці галоўную ўвагу. Школьны год мігам праляціць. Настануць канікулы і тады вы абое будзеце мець час, каб часцей спатыкацца.

„Сэрцайка“

Што чытаюць

У старакорнінскай школе шмат увагі прысвячаюць чытанню прэсы. Вучні гэтай школы добра разумеюць, што прэса з'яўляецца іх прыяцелем і дапаможнікам у вучобе. Найбольш у школе ёсць 73 падпісчыкі „Нівы“. Тыднёвік гэты з'яўляецца дапаможнікам у вывучэнні роднай беларускай мовы. На наступны год кожны вучань выпіша „Ніву“ адразу на цэлы год.

На занятках грамадзянскага выхавання вучні выкарыстоўваюць „Ніву“, „Трыбуну Люду“ і „Газету Беластоцкую“. „Трыбуны Люду“ ў школе ёсць 21 экз., а „Газеты Беластоцкай“ — 29 экз.

У навучанні польскай мовы выкарыстоўваюцца „Пломык“, „Пламычак“, „Свершчык“ і „Місь“. Падпісчыкамі „Пламыка“ з'яўляецца 25 вучняў, „Пламычка“ — 32 вучні, „Свершчыка“ — 23 вучні і „Міся“ — 10 вучняў.

В. С.,
Стары Корнін

Сажалка

Супрацьпажарны басейн у Дубічах Царкоўных мае сваю гісторыю. На паплавах калісьці была крыніца і грузалевіна. Жыхары тут вырашылі капаць сажалку і выкапалі яе грамадскім чынам. А вады хоць адбаўляй — крыніца ж, і ў кожную пару года вада ёсць.

Прайшоў аднак нейкі час, басейн зарос дзе-ні-дзе травою, дно зацягнула мулам.

Дубіцкія пажарнікі вырашылі прачысціць сажалку, берагі ацэментаваць, басейн пашырыць, паглыбіць і абгарадзіць гэта месца. Работа ідзе.

М. Панфілюк

У АДКАЗ НА НАШУ КРЫТЫКУ

Што з поштай у Юшкавым Грудзе

АДКАЗВАЕ:

Obwodowy Urząd Pocztowo-Telekomunikacyjny Białystok 1.

W odpowiedzi na pismo Wasze, dotyczące notatki w czasopiśmie „Niwa”, omawiającej ciężkie warunki pracy zatrudnionych w urzędzie pocztowo-telekomunikacyjnym Juszkowy Gród pracowników, ze względu na małą powierzchnię użytkową tej placówki, wyjaśnia się następująco:

Budynek, w którym mieści się placówka pocztowa w Juszkowym Grodzie stanowi własność resortu Łączności i jest zbyt szczupły, aby można było zwiększyć w nim powierzchnię użytkową dla potrzeb poczty.

W chwili obecnej w tymże budynku zamieszkuje także naczelnik urzędu, zajmując lokal o powierzchni 18 m².

Obwodowy Urząd Pocztowo-Telekomunikacyjny zdając sobie sprawę z trudnych warunków pracy tej placówki i w trosce o poprawę tych warunków, zwrócił się z pismem Nr AG. 231 z dnia 30 września 1972 r. do Prezydium Powiatowej Rady Narodowej w Białymstoku o przydzielenie lokalu dla UPT Juszkowy Gród z chwilą likwidacji Gromadzkiej Rady Narodowej w tejże miejscowości. Lokal ten odpowiadałby w pełni wymogom, stawianym placówkom pocztowym, po przeprowadzeniu adaptacji.

Na pismo to nie otrzymaliśmy żadnej odpowiedzi z Wydziału Budżetowo-Gospodarczego Prezydium PRN w Białymstoku i jak nam wiadomo lokal ten został przydzielony dla Ośrodka Zdrowia.

Obecnie dowiedzieliśmy się, że w Juszkowym Grodzie od dłuższego czasu stoi próżny i niewykorzystany lokal po byłej „Agronomówce”. W związku z tym występujemy do Prezydium PRN w Białymstoku z wnioskiem o wydzierżawienie tego lokalu poczcie i będziemy niezmiernie wdzięczni Redakcji „Niwa”, gdyby zechciała sprawę naszą poprzeć u odnośnych czynników, w których gestii jest pozytywne wniosku naszego załatwienie.

Nawiązując do wypowiedzi autora notatki jakoby pracownicy UPT Juszkowy Gród deklarowali czyn społeczny w rozbudowie placówki, a OUPT odpowiedział rzekomo, że brak na ten cel środków finansowych, stwierdzamy, że żadna deklaracja pracowników do nas nie wpłynęła, jak też i nie udzielaliśmy żadnej odpowiedzi.

Dyrektor OUPT
Janina Symaniukсztis

Ад рэд. Выслалі мы ліст да кіраўніка бюджэтна-гаспадарчага аддзела Прэзідыума ПРН у Беластоку, у якім падтрымліваем просьбу ОУРТ — памагчы атрымаць пустую агранамоўку на памяшканне для пошты.



Ніна Гаўрылюк, Бельск. Вершы можна друкаваць. Найлепшы з прысланых чатырох — гэта „Песня і ўсмешка“. Адносна прозы — прабуйце далей, ды пазбягайце нагрузкі лішніх, часта выпадковых слоў. Пры наяўнасці псіхалагічных схільнасцей у творчасці, якія ў вас выяўляюцца, чым менш слоў, тым лепш. А цяпер адказы на вашы пытанні. 1. „Што рабіць, каб не карыстацца слоўнікам?“ Але ж, слоўнік для пісьменніка — як вада, як паветра! Тым чалавек разумнейшы, тым часцей заглядае ў слоўнік. У ніякім выпадку не раім пазбягаць слоўніка. Раім яшчэ чытаць беларускую паэзію і прозу — гэта дасканалы спосаб навукі. 2. „Хацела б пісаць пра сённяшняе жыццё вёскі ці горада“. Мы як найбольш за. Можна пісаць у форме газетных інфармацый, а можна і апавяданнем. Мы вельмі высока цэнім публіцыстычныя формы — інфармацыі, артыкулы, рэпартажы. Іх людзі надта ж ахвотна чытаюць. 3. „Як заспакоіць патрэбу пісання?“ Пісаць. А аб чым? Аб усім, аб добрых і дрэнных падзеях, аб людзях і іх працы.

Павел Гутнік, Агульнаадукацыйны ліцэй у Міхалове. „Адказ Яўгенію Семянюку“ надрукуем. Вельмі ж рады, што пішаце многа і добрых, добрай беларускай мовай напісаных інфармацый з жыцця свае акаліцы. Сардэчнае дзякуй.

Анна Дзянісюк, Плёскі. „У гадавіну смерці...“ з часам надрукуем.

КІНО

ГАЙНАЎСКІ ПАВЕТ

Белавежа
„Mężczyzna, który się podoba” (franc.), 11—12. „Tydzień szaleńców” (rumuński), 13—14. „Wydra pana Grahama” (angl.), 15—16.

Чаромуха
„Jesteś już mężczyzną” (USA), 11—12. „Lampy naftowe” (czeski), 15—16.

Кляшчэлі
„Fraulein doktor” (jugosł.), 11—12. „Śledztwo skończone, proszę zapomnieć” (włoski), 13—14. „Abel twój brat” (polski), 15—16.

Нараўка
„Anatomia miłości” (polski), „Księżniczka Czardasza” (węgierski), 12—16.

Нарва
„Morderca samotnych kobiet” (NRD), „Tylko wtedy gdy się śmieję” (angl.), 12—16.

Чыжы
„Zaproszona” (franc.), „Ślub bez obrączki” (czeski), 12—16.

Дубічы Царкоўныя
„Nieznany” (polski), „Dzień ostatni, dzień pierwszy” (radz.), 12—16.

Арэшкава
„Staroświecki dramat” (radz.), „Brylanty pani Zuzy” (polski), 15—16.

БЕЛЬСКІ ПАВЕТ

Орля
„Zabijcie czarną owcę” (polski), „Naszyjnik dla mojej ukochanej” (radz.), 12—16.

Райск
„Niech bestia zdycha” (franc.), „Jezioro osobliwości” (polski), 12—16.

БЕЛАСТОЦКІ ПАВЕТ

Гарадок
„Zdobycz” (franc.), 15—16.

Міхалова
„Zdobycz” (franc.), 11—12. „Smak zemsty” (hiszpański), 13—14. „Niebieski żołnierz” (USA), 15—16.

САКОЛЬСКІ ПАВЕТ

Шудзялава
„Kajtek i nowy braciszek” (węgierski), „Poszukiwany — poszukiwana” (polski), 12—16.

СЯМЯЦІЦКІ ПАВЕТ

Нурэц
„Pogromca zwierząt” (rumuński), 11—12. „Białe słońce pustyni” (radz.), 13—14. „Ja wam pokażę” (NRD), 15—16.

Мілейчыцы
„Krwawa bajka” (jugosł.), 11—12. „Telegram” (radz.), 13—14. „Sekret” (polski), 15—16.

Ніва

Organ Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego. Wydawca: Białostockie Wydawnictwo Prasowe RSW „Prasa-Książka-Ruch”. Redaguje Kolegium. Adres Redakcji: Białystok, ul. Wesołowskiego 1. Numer przy przesyłkach pocztowych: Redakcja tygodnika „Niwa”, Skr. poczt. 281, 15-950 Białystok. Telefony: Redaktor Naczelny i Sekretarz Redakcji 2-10-33, publicyści 2-32-41 do 45 (centrala). Cena prenumeraty krajowej: rocznie: 28,80 zł, półrocznie: 14,40 zł, kwartalnie: 7,20 zł. Prenumeraty przyjmowane są do dnia 10 każdego miesiąca poprzedzającego okres prenumeraty. Prenumeraty na kraj dla czytelników indywidualnych przyjmują Urzędy Pocztowe oraz listonosze. Można również wpłaty dokonywać na konto I Oddziału Rejonowego „Ruch” w Białymstoku 150-6-161 NBP I OM Białystok. Na odwrocie blankietu należy podać okres prenumeraty i tytuł zamawianego pisma. Wszystkie instytucje państwowe i społeczne w miastach, zamawiają prenumeratę wyłącznie za pośrednictwem Oddziałów i Delegatur RSW „Prasa-Książka-Ruch”. Pozostałe — mające siedzibę na wsi lub w innych miejscowościach, w których nie ma Oddziałów i Delegatur zamawiają prenumeratę za pośrednictwem Urzędów Pocztowych. Prenumeratę na zagranicę przyjmuje: RSW „Prasa-Książka-Ruch”, Biuro Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych, Wronia 23, 00-840 Warszawa. Konto PKO Nr 1-6-100024. Cena prenumeraty dla zagranicy jest wyższa od prenumeraty krajowej o 40 proc. Nr indeksu 36911.

BZGraf. Nakład 7.669 K-3

БАРАДА

Вырашыўшы падагрэць цікавасць мілых жанчын да сваёй асобы, я адпусціў бараду. Вынік перавысіў мае самыя смелыя спадзяванні. Я пачуў процьму ацэнак, парад, пытанняў і параўнанняў.

— Якая краса! Вам вельмі да твару барада, — сказала Марыя Іванаўна.

— Якая гадасць! Навошта вы гэта зрабілі? — усклікнула Вольга Пятроўна.

— Як ні дзіўна, барада вас малодзіць, — заўважыла Ніна Васільеўна.

— Гэта барада састарыла вас на дваццаць год... — дакарала Вера Мікалаеўна.

— Было б лепей, калі б яна была больш пышнай, — параіла Зоя Львоўна.

— Вам лепш падыходзіла б клінцам, — падказала Клаўдзія Андрэеўна.

— Вам трэба яе крыху падфарбаваць, — вырашыла Галена Маркаўна.

— Астаўце лепш адны вусы... — заявіла Ірына Раманаўна.

У мяне пыталі, ці доўга я яе адрошчваў, ці не чэшацца яна, ці горача ў барадзе летам, ці часта даводзіцца яе падстрыгаць, як аднеслася да барады мая жонка...

Параўнанні насілі літаратурны і нават гістарычны характар. На жаль, я пачаў падлік не адразу, але ўсё ж налічыў дваццаць шэсць Хэмінгуэяў, чатырох Заля, двух Чэхавых, трох Генрыкаў Чацвертых.

Некаторыя знаёмыя раптам змаўкалі на паўслове, задумена праводзілі далонню па сваім голым падбародку і, звяртаючыся не столькі да мяне, колькі да саміх сябе, запытвалі: „А ці не адпусціць і мне?..“

Я нашу бараду вось ужо паўгода, але цікавасць да маёй асобы, я чую, падае. Прадбачваю, што ўрэшце яна пачне канчаткова падаць. На гэты выпадак у мяне сёе-тое назапашана. Дамы нават і не падазраюць, што я задумаў. Я яе... збрыю.

Уладзімір Ліўшыц

ЧАГО Ў СПОРЦЕ НЕ БЫВАЕ!

— Я чакаю сумленнага бою.

ХТО НЕ П'Е

На дакаранне сваёй жонкі п'яны муж апраўдваецца:

— Ды хто яе не п'е, гэтай гарэлкі? Хіба той, у каго грошай няма, ды яшчэ сава: удзень яна не бачыць, а ўначы магазін закрыты.

ТАЛЕРАЧКА

Аматар старажытнасцей зайшоў у антыкварную краму і, не знайшоўшы на паліцах нічога цікавага, прыкмеціў, што кошка ўладальніка крамы хлёбае малако з талерачкі, якая, як ён акрэсліў адразу, мае велізарную вартасць. Пагладзіўшы кошачку па шэрсці, калекцыянер спытаў гаспадара, ці не прадасць ён яе.

— Калі ласка, — адказаў гаспадар, — такому паважанаму знаўцы і пастаяннаму кліенту адмовіць не магу. Яна каштуе 50 долараў.

— Калі ласка, вось грошы. Заадно я вазьму і талерачку, з якой кіска п'е малачко, — яна ж да яе прывыкла!

— Што вы! Гэта талерачка каштуе пяць тысяч долараў!

— Чаму ж тады вы наліваеце ў яе малако для кошкі?

— Таму, што такім спосабам я прадаў ужо 137 кошак...

НІЎКА

— Я непісьменны, доктар...

ПАМЫЛКА

Сярод ночы ў адзін з нумароў гасцініцы стукае дзяжурны.

— Уставайце! У гасцініцы пажар...

— Пажарнік жыве ў суседнім нумары, — пачулася з-за дзвярэй сонны голас.

ПЕРАПЛЮНУЎ

Размаўляюць двое пра сабак.

— Ты ведаеш, мой Тузік можа да дзесяці лічыць.

— Гэта я даўно ведаю.

— Адкуль?

— Мой Бобік пра гэта мне расказаў.

Зноў я пераблытаў закліванне.

СПОВЕДЗЬ ПАДХАЛІМА

„Падхалім ды падхалім...“ —
Шэпчуцца за вочы...
Пабываць бы ў скуры ім
У маёй аднойчы.

Паспыталі б „каравай“,
А калі б прыпекла,
Зразумелі б, што не рай
У мяне, а пекла.

Што не рай — не гавары,
Можа быць прамашка:
Падхалімам быць, сябры,
Цяжка, вельмі цяжка.

Тут асобы трэба нюх,
Каб не быць на мелі:
Устаў начальнік сёння з двух,
А ці толькі з левай?

І асобы мець сакрэт
На любое выйсце —
Як зайсці у кабінет
І назад як выйсці.

Трэба ведаць што між тым
(Каб не змог надзьмуцца),
Як сагнуцца перад ім
І як разагнуцца.

Толькі гэта іншы раз
Мне вылазіць бокам...
Запытаць хачу я ў вас:
Хіба ж гэта лёгка?

Уладзімір Правасуд

...Зайздроснік не змагаўся за сваё шчасце. Яму хапала чужых няшчасцяў.

...Граючы на нервах, не траціў пачуцця такту.

ГУМАР З

Абое разумныя

У аднаго пана быў парабак, звалі яго Іванам. Вось пан за штосьці пасварыўся з суседнім панам, і пачалі судзіцца. Прыйшла пану павестка ехаць на суд, пан і кажа:

— Іван, запрагай коней, паедзем у горад на суд.

Запрог Іван коней, пад'ехаў пад ганак, пан сеў — і паехалі. Едуць палянкаю, а пану з думкі не сходзіць суд, хто ж выйдзе пераможцам, хто разумнейшы між імі, а далей і кажа:

— Іван, а хто, па-твойму, разумнейшы — ці пан Траханоўскі, ці я?

А Іван адказвае:

— Ды ён, пане, дурнейшы яшчэ ад вас, а як і не дурнейшы, то такі, як вы!

З ЧАГО ДВОЙКА

Калі прыйшоў Васілёк са школы, бацька ўзяў дзённік у рукі і спытаў:

— Дык з чаго двойка?

Васілёк перапужана сказаў:

— З чарніла.

МІНІБАЙКІ

Метад доказу

Нейкі Філосаф, убачыўшы Дурня, які лупцаваў свайго Асла, усклікнуў:


— Устрымайся, сын мой, малю цябе, устрымайся. Той, хто ўжывае насілле, ад насілля ж і гіне.

— Гэта якраз тое, што я прабую ўбіць у галаву гэтай скаціне, — адказаў Дурны, працягваючы рупліва дубасіць жывёліну. — Ён мяне ўдарыў.

„Несумненна, — разважаў Філосаф, працягваючы свой шлях, — мудрасць дурняў не менш глыбокая і блізкая да ісціны, чым наша, але, я бачу, іх метад доказу куды больш пераканаўчы“.

— Не ўяўляю, як гэта магло атрымацца...

НОВЫЯ ПАТЭНТЫ



ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Па просьбе Веры і Марысі Манцюк з Мікуліч змяшчаем савецкую песню

МАМА МОЯ

Слова Владимира Харитонова
Музыка Александра Аверкина

Помню бои,
Помню жестокие ливни.
Слышу во сне,
Как я кричу из огня:

Мама моя,
Сколько живу я на свете,
Ждешь-не дождешься меня!

Я не забыл,
Как разлучали дороги,
Ночью и днем
Грелась кострами земля.

Мама моя,
Сколько живу я на свете,
Ждешь-не дождешься меня!

Где бы ни шел,
Всюду была ты со мною.
Жил и живу,
Родине верность храня.

Мама моя,
Сколько живу я на свете,
Ждешь-не дождешься меня!

Рельсы гудят,
Снова тебя покидаю.
На проводах
Ветер играет звеня.

Мама моя,
Сколько живу я на свете,
Ждешь-не дождешься меня!

КУРЁЗЫ

ПА ЗАКОНУ ІСЛАМА


На думку галоўнага міністра Паўночна-Заходняй пагранічнай правінцыі Пакістана Маўляна Муфці Махмуда, дзеючая мера пакарання (шасцімесячнае турэмнае зняволенне) за злоўжыванне спіртнымі напіткамі недастаткова суровае і не спыняе прыхільнікаў „зялёнага змея“. Мусульманін Махмуд прапанаваў караць сваіх адзінаверцаў, якія пакланяюцца Бахусу, 80 ударамі бізуна, як таго патрабуе іслам. Пакістанцы — п'ючыя і няп'ючыя — ажыўлена абмяркоўваюць гэту прапанову.

КВАДРАТНЫЯ МЕТРЫ МАСТАЦТВА

Амерыканскі мастак Дж. Дэвіс нечакана стаў знакамітасцю, напісаўшы ўсяго адну карціну. Яна заняла ўсю плошчу перад гарадскім музеем выяўленчага мастацтва ў Філадэльфіі — 3.500 квадратных метраў. Карціна ўяўляе сабой спалучэнне рознакаляровых палос. На яе стварэнне пайшло 2.000 літраў фарбы. Масляная фарба добра правікла ў асфальт, і аўтар мяркуе, што карціна захаваецца не менш пяці гадоў. Мяркуюць, што зайздросныя канкурэнты Дэвіса разважаюць падобным чынам футбольнае поле або мясцовы аэрадром.

АРОЛ АТАКУЕ... ПЛАНЕР

Непадалёку ад Марселя буйны арол атакаваў планер, на якім французскі пілот П'ер дэ Бокэ выконваў фігуры вышэйшага пілатажу. Раззлаваная птушка нечакана напала на планер і нанесла яму даволі сур'ёзныя пашкоджанні. Пілоту з вялікай цяжкасцю давялося ўцячы ад праследавання і зрабіць пасадку.



Спярша вянком увенчваюць, а ўжо потым яго ўскладаюць. Але бывае і наадварот.